

ДЗЯКУЮЧЫ ГАЗЕЦЕ ЗНАЙШОЎ РАДНЮ 13

ТАКІЯ ДОЎГАЧАКАНЫЯ ДАЖДЖЫ 16



Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

9 ЧЭРВЕНЯ 2023 г. ПЯТНІЦА № 109 (29989)

## КОРАТКА

• У гісторыка-культурным комплексе «Лінія Сталіна» пры падтрымцы Міністэрства абароны 10 чэрвеня пройдзе паказальны заезд Т-72 па маршруце «Танкавы біятлон».

• **Мінтранс прапануе абмеркаваць праект указа аб аўтамабільных перавозках пасажыраў. Свае заўвагі і прапановы можна выказаць у спецыяльнай тэме на Прававым форуме з 8 да 18 чэрвеня.**

• Беларусы запрасілі кубінскіх спартсменаў на II Гульні краін СНД.

• **Дапоўнены спіс спецыяльнасцяў для залічэння выпускнікоў аграрных класаў у ВНУ без экзаменаў.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар ПЕТРЫШЭНКА, віцэ-прэм'ер:**

*«Квітнеючую эканоміку пад сілу пабудаваць толькі энергічным і творча думаючым асобам, якія не баяцца ісці наперад, браць адказнасць на сябе. Менавіта маладым пад сілу рашэнне такіх задач. Прыемна бачыць, што моладзь ставіць перад сабой амбіцыйныя мэты, паспяхова рэалізоўвае свой патэнцыял, імкнецца актыўна развіваць маладзёжнае прадпрымальніцтва. У Беларусі сфарміравана спрыяльнае дзелавое асяроддзе для прадпрымальніцтва, у тым ліку маладзёжнага. Дзейнічае Беларускі фонд падтрымкі прадпрымальніцтва, цэнтры і інкубатары для развіцця прадпрымальніцтва. У краіне налічваецца больш за 113 такіх цэнтраў і 26 інкубатараў».*

З першых вуснаў

# «ТОЛЬКІ АДЗІНСТВА РОБІЦЬ НАС МАЦНЕЙШЫМІ»

## Аб чым Прэзідэнт Беларусі гаварыў на сустрэчы з сакратарамі саветаў бяспекі дзяржаў — членаў АДКБ

**Як звярнуў увагу на пачатку сустрэчы Аляксандр Лукашэнка, дыялог паміж нашымі краінамі ў сферы ўмацавання калектыўнай бяспекі ў цяперашні час актуальны як ніколі. «Скажу прама: ад вас, галоўных памочнікаў кіраўнікоў дзяржаў у вашых краінах па бяспецы, многае залежыць», — задаў тон размове беларускі лідар. Такія сустрэчы, па яго словах, даўно выйшлі за рамкі пратакольных, паколькі геапалітычная сітуацыя патрабуе выпрацоўкі своечасовых рашэнняў. У сувязі з гэтым Прэзідэнт нагадаў пра сваю нядаўнюю сустрэчу з кіраўнікамі органаў бяспекі і спецыяльных службаў дзяржаў — удзельніц СНД, якая на мінулым тыдні прайшла ў Палацы Незалежнасці, пасля чаго адбылася нарада кіраўнікоў спецслужбаў. Беларускі лідар у курсе: размова была вельмі эфектыўная і важная.**



Фота БелТА.

### «ТРЭБА ДАМАЎЛЯЦЦА, ПАКУЛЬ ГЭТА МАГЧЫМА»

Звяртаючыся да сакратароў саветаў бяспекі дзяржаў — членаў АДКБ, Аляксандр Лукашэнка ўказаў на напружаную ваенна-палітычную абстаноўку. «Але гэта толькі вяршыня айсберга, — адзначыў ён. — ***У аснове ўсіх гарачых канфліктаў ляжыць масіраванае гібрыднае ўздзеянне на ключавыя сферы нашага грамадскага жыцця: эканамічную і інфармацыйную, біялагічную, сацыяльную, гуманітарную і нават духоўную. Наступаюць па ўсіх франтах.*** І вольнага месца няма».

Кіраўнік дзяржавы акцэнтаваў увагу на тым, што ўсюды сітуацыя вельмі моцна напружана. Аб гэтым сведчаць падзеі і на Каўказе, і ў Цэнтральнай Азіі. Неспакойна і ў суседніх з намі Украіне, Польшчы і Прыбалтыцы. ***«На фоне таго, што адбываецца, мы маем справу з фактам крушэння ўсёй архітэктуры міжнароднай і рэгіянальнай бяспекі, якая фарміравалася дзесяцігоддзямі,*** — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Па прыклады далёка хадзіць не трэба. Канфлікт на тэрыторыі Украіны — гэта адзін з многіх прыкладаў таго, як заходнія эліты выкідваюць трыльёны долараў на мілітарызацыю і спусташэнне дзяржаў».

Прэзідэнт заўважыў, што любая нарада па пытаннях бяспекі не абыходзіцца без абмеркавання сітуацыі ва Украіне. Як вопытны палітык Аляксандр Лукашэнка перасцярог ад спробы шукаць пэўныя прычыны. «Раней ці пазней мы будзем казаць аб прычынах гэтага канфлікту, — перакананы ён. — ***Але цяпер найважнейшае пытанне — спыніць гэты канфлікт.*** Паколькі мы з Расіяй на адным баку (дзве дзяржавы запісалі ў «суагрэсары»), павінен сказаць, што «суагрэсары» з трэцяга дня канфлікту, а можа, і з першага, прапанавалі мірны працэс. І ён пачаўся тут, у Беларусі».

На нашай тэрыторыі прайшлі тры пасяджэнні мірных перагавораў. Затым украінскай дэлегацыі далі каманду (Аляксандр Лукашэнка гэта ведае дакладна) у Беларусь не ляцець. Мірныя перагаворы працягнулі ў Стамбуле, дзе быў выпрацаваны праект. Прычым, як расказаў беларускі лідар, з вялікімі ўступкамі з боку Расійскай Федэрацыі. Кіраўнікі дэлегацый узгаднілі гэты праект — на гэтым перагаворы аб міры скончыліся. І Прэзідэнт Беларусі ведае, чаму: «Бо, хутчэй за ўсё, Украіна гэтых рашэнняў ужо не прымала тады, што ўжо казаць цяпер. ***Цяперашні момант характарызуецца тым, што Захад, які, натуральна, ваюе там (калі б там не было заходняй зброі і наёмнікаў, даўно б ужо ўсё скончылася), чакае вынікаў «контрнаступу».***

СТАР. 2

Інавацыі

# НАША БІЯТЭХНАЛАГІЧНАЯ БУДУЧЫНЯ

## Як беларускія навукоўцы ствараюць канкурэнтаздольную галіну



**Дзякуючы навуковым прарывам у свеце біятэхналогій за апошняе дзесяцігоддзе яны па інвестыцыйнай прыцягальнасці даганяюць IT-індустрыю. Прадукцыя, якая атрымліваецца з дапамогай прамысловых біятэхналогій, мае выхад практычна ва ўсе галіны. У энергетыцы гэта розныя віды біяпаліва. У медыцыне — сыравіна для фармацэўтычнай прамысловасці і біяфармацэўтычныя тэхналогіі, у сельскай гаспадарцы — сродкі аховы раслін і жывёл, мікробныя ўгнаенні, кармавыя дабаўкі, у харчовай прамысловасці — ферментныя прэпараты, харчовыя дабаўкі з лячэбна-прафілактычнымі ўласцівасцямі, вугляродна-энергетычныя сумесі, заменнікі цукру і г. д. Тэмпы росту біятэхналогій у свеце неверагодна хуткія. Калі ў 2020 годзе сусветны рынак біятэхналогій ацэньваўся ў 670 мільярдаў долараў, то да 2025 года, як чакаецца, ён вырасце да 2,3 трыльёна долараў. Толькі аб'ёмы вытворчасці дыягнастычных набораў для вызначэння COVID-19 вырастуць да 2026 года да 8 мільярдаў долараў.**

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

23109

9 771990 763008

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# «ТОЛЬКІ АДЗІНСТВА РОБІЦЬ НАС МАЦНЕЙШЫМІ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Кажучы аб «контрнаступе» ўкраінскай арміі, Аляксандр Лукашэнка агучыў інфармацыю, якая поўнасцю супадае з тымі звесткамі, якія ён атрымаў ад Прэзідэнта Расіі. «За тры дні каля трох дзясяткаў танкаў знішчана (наступаючых, украінскіх) — абараняцца прасцей, чым наступаць, — заўважыў кіраўнік дзяржавы. — 120 або 130 БМП — за тры дні. І, самае страшнае, больш як 2100 загінула ўкраінцаў. 2100! З гэтага боку — крыху больш за 70. Вось вам вынік гэтай спробы «контрнаступу».

Беларускі лідар удакладніў, што «контрнаступам» была вялікая дэзынфармацыя з украінскага боку. «Ніякага «контрнаступу» няма і быць не можа, — падкрэсліў ён. — А раптам — вось вынік за тры дні... Самае галоўнае — чацвёрты-пяты дзень цішыня. Аб чым гэта сведчыць? Пацярпелі сур'ёзнае паражэнне, селі і думаюць (Захад), што рабіць далей».

А што рабіць далей? Іншага варыянта, аб чым не раз казаў Аляксандр Лукашэнка, як садзіцца за стол перагавораў, няма. Гэта, па яго словах, і пазіцыя Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі. ***«Таму мір і толькі мір, — акцэнтаваў увагу беларускі лідар. — Але мір не патрэбен. Захад жалезабетонна зачапіўся за Украіну, каб падмяць пад сябе Расію, выцерці аб яе ногі. Але гэтага не будзе! Вы ведаеце расіян, нас — на калені мы не ўстанем. Таму трэба дамаўляцца, пакуль гэта магчыма. Далей будзе горш».***

## «КАЖУЧЫ АБ ПРЫЧЫНАХ, ТРЭБА ГЛЯДЗЕЦЬ ГЛЫБЕЙ»

Як канстатаваў кіраўнік дзяржавы, нарошчваецца практыка разнастайных аднабаковых абмежавальных мер і санкцый. «Слухайце, ну не прайшло, яўна не прайшло, — кажучы аб тым, чаго дабіваліся арганізатары санкцыйнага ціску, адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Больш за тое, пічканне зброяй (гэта мы бачым тут, знаходзячыся ў гэтым «катле» ў цэнтры Еўропы), нагнятанне абстаноўкі, канфрантацыя і вялізныя грошы, якія траціць перш за ўсё Еўропа. ***Прычына гэтага канфлікту нашмат глыбейшая, чым Украіна. Што такое для іх Украіна? Для амерыканцаў важна паставіць на калені Еўропу. Яны ім пакажуць, што такое ўводзіць еўра супраць долара.*** Гэта таксама зразумела: еўра пачаў адваёўваць у свой час месца пад сонцам. Гэта амерыканцам не трэба. А фінансы — крывяносная сістэма».

Прэзідэнт перакананы: менавіта з-за гэтага і пачаўся ціск на Еўропу з боку ЗША. «Яны хочуць расчляніць Еўропу, адгарадзіць яе ад нас ад Балтыкі да Чорнага мора — праз Польшчу, Украіну, — патлумачыў кіраўнік дзяржавы. — ***З Беларуссю не атрымалася. Была задума гэты санітарны кардон выбудаваць ад Смаленска і туды, на Балтыку. Але цяпер узбройваюць Польшчу, Украіну. Трэба, каб Украіна перамагла — гэта іх залатая мара.*** Вось задума».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Польшча сапсавала адносіны не толькі з намі. «Вы ж бачыце, што адбываецца ў палякаў з немцамі, — звярнуў увагу ён. — Вы што думаеце, палякі такія смелыя, каб выставіць рахунак немцам па рэпарацыях за Другую сусветную вайну? Ды не. Амерыканцы (мы гэта таксама бачылі) ціхенька падказалі: душыце немцаў, бо ў Еўропе немцы — асноўная сіла. Вы думаеце, «брэксіт», калі Вялікабрытанія выйшла з Еўрапейскага саюза, — гэта проста так? Калі б амерыканцы былі зацікаўлены ва ўзмацненні Еўрасаюза, яны б ніколі на гэта не далі дабро і не пайшлі. Але яны «адарвалі» Вялікабрытанію — магутную ў эканамічных адносінах ды і ў ваеннапалітычных. Ім трэба гэты «кацёл» заваліць, каб панаваць. ***Яны ж цудоўна разумеюць, што асноўныя пункты росту ў свеце пасля ЗША — гэта Еўрапейскі саюз, Кітай і наша прастора, дзе мы «асмеліліся» выступіць.*** Таму, кажучы аб прычынах, трэба туды глыбей глядзець».

Беларускі лідар аддае належнае расіянам. «Яны своечасова сказалі: добра, гэта вашы праблемы, але вы гарантуйце нам бяспеку, і беларусам у тым ліку, — згадаў дэталі тых падзей Прэзідэнт. — Адказ на гэтую просьбу аб гарантыях вы бачылі. Цяпер яны кажуць: несур'ёзна, што Расія патрабавала гэтую «паперку» па бяспецы. А чаму несур'ёзную «паперку» не далі ёй? Узялі б і далі адказ на гэтую «паперку». Я маю на ўвазе прапановы па бяспецы на постсавецкай прасторы, і перш за ўсё ў Расіі».

Кіраўнік дзяржавы назваў расійскую спецыяльную аперацыю ва Украіне «падарункам» для Захаду. «І яны тут пачалі чапляцца за яе, каб паставіць на калені нашу прастору, — патлумачыў Прэзідэнт. — А далей — Кітай. Гэта галоўная іх мэта. Ды і потым, «працоўная сіла» пасля Афганістана вызвалілася, яе ж трэба дзесьці прымяняць. Калі і далей будзе так працягвацца, упэўнены, гэта пытанне часу. Наёмнікаў там — мора. Хутка і рэгулярныя войскі з'явяцца, калі мы не спынім гэты канфлікт. Мы да гэтага гатовы».

## «НАМ НЕЛЬГА СТРАЦІЦЬ СВАЁ»

Вяртаючыся да тэмы санкцыйнага ціску, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што санкцыі ўжо ператварыліся з інструмента прымусу да міру і бяспекі ў новую комплексную пагрозу глабальнага маштабу. Ён заўважыў, што цэлыя рэгіёны асуджаныя на голад, холад і галечу. «Яны і вас датычацца, гэтыя санкцыі, — звярнуўся да прысутных беларускі лідар. — Мы ж бачым з расіянамі, як візіцёрыамерыканцы паехалі, пачынаючы ад Арменіі і заканчваючы Таджыкістанам. І пачынаюць на вас ціснуць, каб вы не супрацоўнічалі з намі. Мы гэта бачым».

Менавіта па гэтай прычыне, лічыць Прэзідэнт Беларусі, супрацьдзейнічаць санкцыям трэба комплексна і разам. «Мы — ні беларусы, ні расіяне — не хочам, каб вы трапілі пад санкцыі, супрацоўнічаючы з намі, — падкрэсліў ён. — Мы гэтага не хочам. Ні мы, ні вы ад гэтага нічога не атрымаем, а вы толькі страціце. Але як толькі магчыма (у жыцці шмат ёсць магчымасцяў), мы павінны глядзець у гэты бок — разам. Эканоміка нас да гэтага штурхае».

Па словах кіраўніка дзяржавы, нельга страціць той рынак, які ўжо ёсць. На іншыя рынкі краінам постсавецкай прасторы прабіцца складана — яны ўжо занятыя. «Нават у Афрыку прабіцца складана, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Усё там не проста. Там сутыкнуліся інтарэсы Кітая, Злучаных Штатаў Амерыкі, Еўрасаюза. ***Я не кажу, што не трэба працаваць на рынку Еўрасаюза, Злучаных Штатаў Амерыкі, Блізкага, Далёкага Усходу, індыйскіх, амерыканскіх і іншых рынках. Не, трэба працаваць. Але нам нельга страціць сваё, бо ў выніку мы сыдзем і страцім адзін аднаго».***

У гэтай сувязі беларускі лідар не можа спакойна глядзець на тое, што на прасторы АДКБ узнікаюць канфлікты, а тым больш узброеныя. «І азербайджанцы, і армяне — гэта родныя, як два пальцы на адной руцэ, — адзначыў Прэзідэнт. — Трэба разабрацца ў гэтай сітуацыі». Унесці адпаведныя прапановы па ўрэгуляванні канфлікту Аляксандр Лукашэнка паставіў задачу сакратарам саветаў бяспекі краін АДКБ. «Вы — не староннія назіральнікі ў гэтай сітуацыі, вы — галоўныя нашы памочнікі па пытаннях абароны і бяспекі, — падкрэсліў ён. — Ваша слова вельмі важнае ў краінах. Вас чуюць. На вас рэагуюць».

## «СПАКОЙНА ЖЫЦЬ НЕ ДАДУЦЬ»

Уразлівым элементам сістэмы міжнароднай бяспекі, на думку беларускага лідара, стала інфармацыйная сфера. І тут Прэзідэнт зноў звярнуўся да прыкладу Украіны. «Вы, напэўна, здагадваецеся, хто ўзарваў Кахоўскую ГЭС? — задаў ён пытанне прысутным. — Кажуць, на злодзеі і шапка гарыць. Хто першым аб гэтым закрычаў? Зразумела, што ўкраінскаму боку трэба было схаваць гэтыя тры дні «контрнаступу», дзе амаль дзве сотні бронемашын было знішчана і больш за дзве тысячы чалавек загінулі».

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы заўважыў, якую асцярожную пазіцыю занялі Злучаныя Штаты Амерыкі. «Трэба аддаць ім належнае: яны адразу адзначылі, што не могуць сказаць, хто гэта зрабіў, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — Яны павінны разабрацца. З чаго б гэта?»

Прэзідэнт расказаў, што беларускі бок вельмі сур'ёзна займаецца пытаннямі інфармацыйна-псіхалагічных аперацый і супрацьдзеяння ім. Гэтым вопытам мы можам падзяліцца з нашымі партнёрамі па АДКБ, бо менавіта гэтыя краіны, па словах беларускага лідара, непасрэдна знаходзяцца пад прыцэлам гэтага ціску, небяспечнай інфармацыйнай зброі, якая ўвесь час стварае праблемы.

**Камітэт сакратароў саветаў бяспекі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы з'яўляецца кансультатыўным і выканаўчым органам па пытаннях каардынацыі ўзаемадзеяння дзяржаў — членаў АДКБ у галіне забеспячэння іх нацыянальнай бяспекі. Абмен інфармацыяй аб пагрозах і крызісных сітуацыях у рэгіёне і за яго межамі, сумеснае супрацьдзеянне пагрозам нацыянальнай, рэгіянальнай і міжнароднай бяспецы, вырашэнне аператыўных пытанняў супрацоўніцтва — гэта яшчэ далёка не ўсе функцыі, ускладзеныя на камітэт.**

У гэтай сувязі Прэзідэнт згадаў нядаўнія падзеі ў Кыргызстане, дзе была здзейснена спроба расхістаць абстаноўку ўнутры краіны. Не атрымалася — улады зрэагавалі своечасова. Высокую ацэнку гэтым мерапрыемствам даў Аляксандр Лукашэнка: «Малайцы, хлопцы, справіліся. У зародку справіліся, не дазволілі гэтай «заразе» распаўсюдзіцца — значыць, высновы зроблены з гісторыі. Проста малайцы!»

Кіраўнік дзяржавы параіў некаторым адчапіцца ад Кыргызстана. «Яны пачалі падымацца з кален, — удакладніў ён. — Няхай развіваецца краіна, каму яна праблемы стварае? Нікому! Тым не менш хістаюць. Думаеце, проста так? Не. Каб падабрацца праз Кыргызстан да Казахстана, як праз Расію да Кітая». Прэзідэнт параіў звярнуць на гэта ўвагу асабліва ў Казахстане. «Спакойна жыць не дадуць», — перакананы ён.

## «ВЫБУДАВАЦЬ ПЛАН, КАБ БЫЦЬ САМАДАСТАТКОВЫМІ»

Аляксандр Лукашэнка паставіў задачу спецслужбам і праваахоўным органам да канца выбудаваць працэс і ўдасканаліць сістэму крызіснага рэагавання. «Кіраўніцтва апаратаў саветаў бяспекі дзяржаў — членаў АДКБ адыгрывае ў гэтым пытанні вельмі важную каардынацыйную ролю, — заўважыў ён. — Больш скажу: гэта ваша работа, гэта ваша сфера адказнасці. Таму дамаўляйцеся, прымайце рашэнні, уносьце прапановы на зацвярджэнне кіраўнікоў дзяржаў. Не думаю, што тут будзе пэўнае тармажэнне».

Кіраўнік дзяржавы лічыць, што з улікам маштабнай трансфармацыі пагроз ужо цяпер мэтазгодна падумаць над канцэпцыяй новай Стратэгіі калектыўнай бяспекі Арганізацыі на перыяд да 2035 года. Існуючы дакумент прыняты ў 2016 годзе і разлічаны да 2025 года. «Камітэту сакратароў саветаў бяспекі і ў цэлым АДКБ неабходна пачаць работу над узгадненнем падыходаў і выпрацоўкай адпаведных прапаноў адносна будучай архітэктуры бяспекі еўразійскага кантынента — гэта найважнейшае пытанне», — перакананы Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка прапанаваў правесці рэвізію таго, што ёсць у АДКБ. Гэта, па яго словах, адносіцца і да ЕАЭС, і да Саюзнай дзяржавы. «Трэба паглядзець, што нам трэба, а што не трэба, — паставіў задачу беларускі лідар. — Трэба адкінуць тое, што мы прапрацавалі і панапісалі — можа, яно ўжо і не будзе ніколі працаваць. І застануцца асноўныя кірункі. ***Трэба вярнуцца да асноватворных дакументаў. Усё прапісаць жалезабетонна і дамовіцца, што ў выпадку такім характар канфлікту такі, рэагаванне такое. З улікам рэалій трэба ўсё прапісаць, жалезна дамовіцца, што ў такім выпадку мы дзейнічаем так і так».***

Такая рэвізія, на думку Прэзідэнта, неабходная. Многія рашэнні, па яго словах, ужо не працуюць і працаваць не будуць. Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка расказаў аб сваім намеры прапанаваць Прэзідэнту Расіі выпрацаваць праграму дзеянняў. І тут беларускі лідар нагадаў вопыт Савецкага Саюза, калі многія дзяржавы былі пад гнётам. «Нас спрабавалі ўдушыць, але мы, у пэўных адносінах замкнёныя ў сваіх межах, цудоўна працавалі, — згадаў ён. — Мы былі самадастатковымі».

Гэтую прастору, на думку Аляксандра Лукашэнкі, патрэбна адбудаваць. ***«Выбудаваць план, каб мы маглі быць самадастатковымі, — канкрэтызаваў ён. — Каб нас праз долар або яшчэ якую валюту не ставілі пастаянна на калені. Нам трэба выпрацаваць план унутранага развіцця нашай прасторы — перш за ўсё, Расіі і Беларусі, калі мы апынуліся ў адной лодцы. А то нешта робім і аглядваемся — то на Усход, то на Захад, як нам жыць далей. Трэба выкарыстоўваць вопыт мінулага, каб забяспечыць нармальнае жыццё ў будучыні нашай прасторы, бо ў нас адзіны эканамічны рынак і на сёння адзіная абаронная прастора».***

Менавіта гэтымі прынцыпамі і кіраваўся беларускі бок падчас падрыхтоўкі прыярытэтаў беларускага старшынства ў АДКБ. «Нас пачуюць, калі мы разам, адзіным фронтам выступім з міралюбівым і справядлівым парадкам дня ў нашым еўразійскім рэгіёне і падключым да гэтага працэсу, калі гэтага хочуць, ШАС і БРІКС, тым больш што многія краіны і там, і там удзельнічаюць, — заўважыў Прэзідэнт. — Беларусь як старшыня АДКБ гатова прыкласці максімум намаганняў для ўмацавання нашай Арганізацыі і калектыўнай бяспекі ў зоне яе адказнасці».

Напрыканцы Аляксандр Лукашэнка ўдакладніў: «Калі камусьці з дзяржаў — членаў АДКБ трэба выкарыстаць беларускае старшынства, каб данесці да кіраўнікоў дзяржаў і абмеркаваць найважнейшыя пытанні нашай бяспекі, выкарыстоўвайце. Мы да гэтага гатовы. ***Трэба разумець, што народная мудрасць наша гаворыць: адзін у полі не воін. І толькі адзінства робіць нас мацнейшымі.*** Упэўнены, дэвіз нашага старшынства «Праз салідарнасць і супрацоўніцтва да міру і бяспекі» адпавядае інтарэсам усіх нашых дзяржаў, і не толькі нашых».

**Вераніка КАНЮТА.**

# СПРАВЯДЛІВАСЦЬ — НА ПЕРШЫМ МЕСЦЫ

## Наталля Качанава паўдзельнічала ў пасяджэнні Маладзёжнага парламента

**Учора Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА паўдзельнічала ў другім пасяджэнні Маладзёжнага парламента пры Нацыянальным сходзе. Яна заклікала маладых людзей прапаноўваць заканадаўчыя ініцыятывы, больш шчыльна працаваць з мясцовымі маладзёжнымі саветамі, звярнуць увагу на пытанні, якія хвалююць моладзь і датычацца іх здароўя, дэмаграфічнай бяспекі і іншых. А таксама выказала некалькі крытычных заўваг і адказала на пытанні членаў Маладзёжнага парламента.**

На пасяджэнні прысутнічалі і члены маладзёжнага савета горада Наваполацка. Спікер Савета Рэспублікі падкрэсліла, што такая практыка запрашэння маладзёжных саветаў з рэгіёнаў мусіць быць пастаяннай.

— Гэтак жа, як і вы самі ўдзельнічаеце ў нашых мерапрыемствах: пасяджэннях Савета Рэспублікі, прыёмах па асабістых пытаннях, сустрэчах — вы заўсёды з намі. Гэтак жа і побач з вамі мусяць быць члены маладзёжных саветаў з месцаў. Нягледзячы на тое, што ў вас ёсць адзін прадстаўнік ад кожнага рэгіёна, запрасіць увесь маладзёжны савет з рэгіёна было правільным рашэннем. Гэта вопыт, яны мусяць чуць абмеркаванне, якое ў вас праходзіць, — выказала пажаданне Наталля Качанава.

Таксама яна далучылася да абмеркавання пытанняў парадку дня пасяджэння і паўдзельнічала ў дыскусіі. Адзін з прадстаўнікоў Маладзёжнага парламента прапанаваў мясцовыя маладзёжныя саветы раздзяліць на дзве палаты, дзе б у ніжняй былі старэйшыя школьнікі, а студэнты і працоўная моладзь — у верхняй. Наталля Качанава выказала свае аргументы, заклікаўшы даць права мясцовым арганізацыям і рэгіянальным маладзёжным саветам займацца працай, якую яны робяць.

— У нас сёння шмат маладзёжных арганізацый, больш за 40, і няхай яны ўсе працуюць. У Наваполацку, напрыклад, даўно працуе добрая школа лідара, іншыя структуры — і няхай працуюць. Вам не цесна, кожны мусіць займацца сваёй справай. Старшакласнікі ў ніжняй, старэйшыя ў верхняй — гэта няправільна, — выказала меркаванне Наталля Качанава. — Чаму вы не хочаце сёння ўзяць у маладзёжныя саветы старшакласнікаў? Гэта няправільна, бо ў вас не будзе пераемнасці. У першым скліканні Маладзёжнага парламента амаль усе былі школьнікамі і студэнтамі.

Спікер Савета Рэспублікі скіравала маладых людзей да рэальных спраў, якія б прыносілі карысць людзям і дзяржаве.

— Не з гэтага трэба пачынаць: уніфікаваць, мяняць назву... Вы пакажыце сваю работу: унясіце нам прапановы, якія будуць эфектыўныя, крэатыўныя, якія дапамогуць нам вырашаць пытанні, што ставяць перад намі людзі. Вас мусяць ацэньваць не па тым, што вы засвяціліся ў інфармацыйнай прасторы, а па тых ініцыятывах, якія вы прапануеце на карысць нашай дзяржавы і народа.

Наталля Качанава адзначыла, што нядаўна праводзіла прыём па асабістых пытаннях, разглядала пісьмовыя звароты ў Савет Рэспублікі і сустракалася з кадэтамі Полацка.

— І мне некалькі разоў сказалі: «Наталля Іванаўна, у Расіі прынялі законапраект аб забароне электронных цыгарэт, вэйпаў, бо гэта бяда». А чаму няма ад вас прапаноў? Гэта не мы, а вы павінны нам падказваць, калі гэта бяда. А гэта праблема, якую, між іншым, можна ўрэгуляваць заканадаўствам, — прывяла прыклад спікер Савета Рэспублікі.

Яна звярнула ўвагу і на пытанне дэмаграфічнай бяспекі, наркатычных пагроз, па якіх таксама хацелася б чуць меркаванне маладых людзей.

— Я нагадаю пра рашэнні VI Усебеларускага народнага сходу і тыя задачы, якія ставіць перад намі Прэзідэнт. Адно з рашэнняў — шчаслівая сям'я, і гэта ваша поле дзейнасці. Тут вы мусіце быць ініцыятарамі, — заклікала Наталля Качанава і параіла актыўней уносіць прапановы ў дзейныя законы, у план работы над законапраектамі на наступны год.

Засяродзіла спікер Савета Рэспублікі ўвагу на справядлівых адносінах да простых людзей:

— Улада ў нас народная, лавіць нас няма на чым. Што пра нас могуць прыдумаць? Нічога. Пра грошы? Дык мы адкажам: забярыце! Як паўтарае наш Прэзідэнт, калі знойдзеце рахункі, мы іх адразу вам адпішам. Мы жывём як усе звычайныя людзі. Няма ў нас алігархіі. Ходзім у тыя ж крамы, сустракаемся з людзьмі, стараемся захаваць нашу краіну такой жа камфортнай, чыстай, добраўпарадкаванай, дзе справядлівасць стаіць на першым месцы. Галоўнае — справядлівыя адносіны да людзей, а рашэнні, якія прымаюцца, мусяць быць на карысць дзяржавы.

**Алена КРАВЕЦ.**

*Аб чым яшчэ Наталля Качанава гаварыла з моладдзю — чытайце ў наступным выпуску «Мясцовага самакіравання».*

Маладзечна!

# СПЯВАЕМ І АДКРЫВАЕМ КУЛЬТУРУ Ў НОВЫМ КАНТЭКСЦЕ

**Сёння стартаваў XXII Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі «Маладзечна-2023». Штогод ён аб'ядноўвае майстэрства як вядомых артыстаў, паэтаў, кампазітараў, так і таленавітых прадстаўнікоў маладога пакалення. Удзельнікаў, гасцей і наведвальнікаў чакае насычаная праграма. На працягу двух дзён запланавана больш за паўсотні мерапрыемстваў, у якіх знойдзе адлюстраванне галоўны акцэнт культурна-музычнага форуму — Год міру і стваральнай працы.**

Сёлета лакацыямі фестывалю сталі як адкрытыя пляцоўкі горада вакол Цэнтральнай плошчы, так і розныя ўстановы — Палац культуры горада Маладзечна, музычная школа мастацтваў, каледж, касцёл святога Юзафа, кінатэатр, Дом культуры гарадскога пасёлка Чысць, а таксама Музейны комплекс «Вязынка».

— Да найбольш знакавых мерапрыемстваў, куды варта трапіць гасцям культурнага форуму, я аднесла б і вялікую тэатральную вуліцу, дзе праз тэатральнае мастацтва, паэтычнае слова, музыку, выстаўку кніг можна паглыбіцца ў беларускую паэзію і тэатральную дзейнасць, — адзначыла **начальнік галоўнага ўпраўлення культуры Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Ала ШАХОЦЬКА.** — Два дні будзе працаваць канцэртная пляцоўка, дзе ўбачым выступленні аматарскіх калектываў з усіх абласцей нашай краіны. Таксама на фестываль прыедуць госці з Расійскай Федэрацыі. 9 чэрвеня будзе арганізаваны канцэрт артыстаў Маладзёжнага тэатра эстрады. На гэтай жа пляцоўцы нас чакае мерапрыемства «Свята саксафона», дзе пачуем юных і прафесійных саксафаністаў. Цікава будзе наведаць творчы вечар паэта Алега Елісеенкава «Добрыя людзі» з удзелам артыстаў беларускай эстрады. А ў суботу на фестывалі выступіць ансамбль «Бяседа». Адкрыццё дошкі, прысвечанай натхняльніку фестывалю Міхаілу Якаўлевічу Фінбергу, пераносіцца на больш ранні час і адбудзецца ў 19.00 каля цэнтральнага ўвахода Палаца культуры Маладзечна.

Канцэрты, выстаўкі, творчыя сустрэчы, паказы спектакляў, майстар-класы — тут выбраць ёсць з чаго любой аўдыторыі, незалежна ад узросту, упадабанняў і настрою. Што датычыцца вячэрняй праграмы, то ў першы дзень можна завітаць, напрыклад, на «Магію ночы», калі вам даспадобы глядзець мастацкія фільмы пад адкрытым небам. І, вядома, нельга прапусціць урачыстае адкрыццё фестывалю. Калі набыць квіток не паспелі, то ўключыце тэлеканал «Беларусь 1» і глядзіце святочны канцэрт.

Напярэдадні форуму **мастацкі кіраўнік — галоўны дырыжор заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра імя М. Я. Фінберга Максім РАСОХА** распавёў: «Сёлетні фестываль — тая кропка, калі форум разварочваецца ў іншы бок, з улікам таго, якія змены чакаюцца ў некаторых момантах. Мы заўсёды кажам, што ў нас адкрытыя ўсе дарогі для моладзі і іх творчасці. І вось, напрыклад, адкрыццё ў нас будзе з удзелам маладых таленавітых выканаўцаў, якія ўжо заявілі пра сябе і маюць прыхільнікаў. І конкурс маладых выканаўцаў, які праходзіць у рамках фестывалю, дае магчымасць убачыць юныя дараванні, якія прадставяць кожны сваю вобласць, прадэманструюць уласны творчы патэнцыял. Гэты фестываль унікальны, ён мае свой каларыт. Наш калектыў за два дні будзе выступаць на шасці лакацыях. Будзем дарыць добры настрой гасцям культурнага форуму».

**Алена ДРАПКО.**

Блізкая ўлада

# ВЫКАНКАМЫ НА СУВЯЗІ

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

**Тэлефонныя лініі ў суботу, 10 чэрвеня, з 9.00 да 12.00 правядуць:**

- кіраўнік спраў Брэсцкага аблвыканкама Дзмітрый Леанідавіч УЛАСІК. Тэл. 8 016 226 99 26;
- намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Мікалаевіч БЕЛАВУС. Тэл. 8 021 222 22 22;
- намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Дзмітрый Вадзімавіч АЛЕЙНІКАЎ. Тэл. 8 023 233 12 37;
- намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар Францавіч ПРАНЮК. Тэл. 8 015 273 56 44;
- намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Генадзь Іванавіч ДЗЕНГАЛЁЎ. Тэл. 8 022 250 18 69;
- намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч КРУЧАНАЎ. Тэл. 8 017 500 41 60;
- старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Андрэй Аляксандравіч БУГРОЎ. Тэл. 8 017 222 44 44.


| Организатор аукциона | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by | |
|---|---|---|
| Продавец | ОАО «Строймаш», г. Минск, ул. Рыбалко, д. 26, 220033 | |
| **Извещение о проведении открытого аукциона** | **Дата, время проведения аукциона** | **Срок подачи заявления на участие в торгах** |
| **Предмет аукциона:** имущество ОАО «Строймаш» (недвижимое и оборудование) в количестве 15 лотов, по адресу: г. Минск, ул. Рыбалко, 26. Полный состав имущества размещен на сайте организатора аукциона: www.ipmtorgi.by | **10.07.2023 в 14.00** | **с 9.00 08.06.2023 до 17.00 07.07.2023** |

**Место проведения аукциона: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка».** Лица, желающие принять участие в аукционе, обязаны внести задаток и подать организатору торгов в установленный срок заявление с приложением всех необходимых документов по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»

**Задаток 5 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях по курсу НБРБ на дату внесения платежа перечисляется на расчетный счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X. Получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191 224 638

**Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов аукциона определяется ст. 127, 128, 129 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)»**

| Срок подписания договора купли-продажи | **10 (десять) рабочих дней** после проведения аукциона |
|---|---|

**Условия оплаты предмета аукциона**

Победитель аукциона либо претендент на покупку обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее **30 (тридцати) дней** со дня проведения аукциона, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Победитель аукциона либо претендент на покупку обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере от 3 % до 10 % от цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте www.ipmtorgi.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов не менее чем за день до наступления даты проведения торгов без объяснения причин снятия

| Контактные данные | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** |
|---|---|

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Слуцкий Агросервис» (продавец) проводит открытый аукцион**

**ПО ПРОДАЖЕ ЗДАНИЯ СТОЛОВОЙ**

*(составные части и принадлежности: хозпостройка)*
**общей площадью 316,2 кв. м с инв. № 640/С-26850, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 624681302601000698 (право аренды по 30.11.2070) площадью 0,1822 га по адресу: Минская область, Слуцкий район, Весейский с/с, аг. Весея, ул. Шоссейная, 1Б.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона электрических сетей, пл. 0,0201 га; придорожная полоса (контролируемая зона) автомобильной дороги, пл. 0,0194 га.*

Объект обременен договором аренды по 26.10.2024.

**Начальная цена** с НДС (20 %) – **85 020,00** бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены – **8 502,00** бел. руб.

*Начальная цена снижена на 35 %.*

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 20 (двадцати) календарных дней после проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает продавцу затраты на публикацию извещения о проведении аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 11.11.2022, 14.01.2023, 02.03.2023, 15.04.2023, 18.05.2023.

Аукцион состоится **21.06.2023** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **20.06.2023** до **16.00** в каб. 320 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11.**
**Тел. для осмотра (8044) 545 37 36.** УНП 600043896

**Брестский филиал РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» извещает о проведении открытого аукциона**

**Лот: комбайн свеклоуборочный КЛЯЙНЕ SF-10,** год выпуска – 2009, регистрационный знак АА 7955

| Начальная цена, руб. (без учета НДС) | 31 800,00 | Размер задатка, руб. | 3 180,00 |
|---|---|---|---|

**Продавец:** ОАО «Агро-сад Рассвет» Брестская обл., Брестский р-н, аг. Вистычи, ул. Центральная, 22, тел./ф 80162 91 91 32. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./ф 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** р/с BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенного договора купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 11 июля 2023 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, а также их можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 10 июля 2023 г. до 17.00**

# НАША БІЯТЭХНАЛАГІЧНАЯ БУДУЧЫНЯ

## УКЛАД МІКРАБІЁЛАГАЎ

У Беларусі біятэхналагічная галіна таксама інтэнсіўна развіваецца. Пра гэта расказала журналістам на прэс-канферэнцыі **генеральны дырэктар ДНВА «Хімічны сінтэз і біятэхналогіі» Эмілія КАЛАМІЕЦ.**

— Аб'ём вытворчасці біятэхналагічнай прадукцыі ў Беларусі ў 2021 годзе складаў 393 мільёны рублёў, а ў 2022 годзе — ужо 626 мільёнаў. Тэмп росту — 159 працэнтаў! Вялікі ўклад у гэтыя лічбы ўнесла Беларуская нацыянальная біятэхналагічная карпарацыя. Біятэхналогіі аднесены ў нашай краіне да прыярытэтных напрамкаў даследаванняў. Дзяржава аказвае ўсялякую падтрымку, — падкрэсліла Эмілія Каламіец. — У нас ёсць навукова-вытворчы, кадравы патэнцыял, база для падрыхтоўкі спецыялістаў, навуковыя праграмы. Ствараюцца новыя формы арганізацыі і кіравання біятэхналагічнай галіной: навукова-вытворчыя цэнтры, аб'яднанні, асацыяцыі, кластарныя структуры. ДНВА «Хімічны сінтэз і біятэхналогіі» — адзін з прыкладаў. Такія новыя формы забяспечваюць большае ўзаемадзеянне навукі і вытворчасці.

Па словах спецыяліста, біятэхналогіі знаходзяць самае шырокае прымяненне, у тым ліку ў хімічнай прамысловасці, сельскай гаспадарцы, харчовай прамысловасці, вытворчасці лекавых прэпаратаў, распрацоўцы вакцын, тэст-сістэм, метадаў лячэння, у абароне і ўзнаўленні лясных генетычных рэсурсаў, у прыродаахоўнай сферы і біяінфарматыцы.

Інстытут мікрабіялогіі НАН Беларусі валодае цэлым шэрагам апрабаваных навукова-тэхнічных распрацовак для сельскай гаспадаркі, аховы навакольнага асяроддзя, медыцыны, якія характарызуюцца высокай ступенню навізны, эфектыўнасцю і гатовыя да прамысловага ўкаранення.

**Дырэктар Інстытута мікрабіялогіі НАН Беларусі Аляксандр ШЭПШЭЛЕЎ** расказаў журналістам аб некаторых распрацоўках інстытута: «У галіне мікробных угнаенняў нашымі вучонымі быў створаны прэпарат, накіраваны на аднаўленне і падтрыманне зялёных насаджэнняў уздоўж дарог, якія апрацоўваюцца процігалалёднымі рэагентамі. Ён вельмі добра сябе зарэкамендаваў. Выпрабаванні, праведзеныя ў Першамайскім раёне сталіцы, паказалі яго эфектыўнасць. Яшчэ адна з апошніх распрацовак, якой мы ганарымся, накіравана на стварэнне кератыназы — ферменту, які расшчапляе пер'е ў птушкагадоўлі або выкарыстоўваецца ў касметалогіі для стварэння тых ці іншых касметычных сродкаў.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## АДМЫСЛОВЫ РАЦЫЁН ДЛЯ... ПАЛЯРНІКАЎ

**Дырэктар Інстытута мясамалочнай прамысловасці НАН Беларусі Гардзей ГУСАКОЎ** паведаміў, што ў інстытута ёсць планы па стварэнні цэлай лінейкі біялагічна актыўных дабавак: «Мы цяпер вядзём актыўную работу з прадпрыемствам «Акадэмфарм». Прапрацоўваюцца розныя параметры нашых субстанцый, каб іх можна было акрэсліць як біялагічна актыўныя дабаўкі. Можа быць, яны будуць у сухім выглядзе, а можа, і ў вадкім».

Ён адзначыў, што біятэхналогіі актыўна прымяняюцца ў аграрнай сферы. Нацыянальная акадэмія навук праводзіць поўны спектр навуковых даследаванняў ва ўсім аграпрамысловым комплексе: пачынаючы ад сельскай гаспадаркі, атрымання сыравіны, заканчваючы яе перапрацоўкай і давядзеннем прадукцыі да канчатковага спажыўца. «Наш інстытут прапануе харчовай прамысловасці новыя віды перапрацоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі. У нас ёсць біятэхналагічны аддзел, які мае ў падпарадкаванні цэлую вытворчасць. Вырабляюцца закваскі для малочнай прамысловасці. У інстытуце ёсць нацыянальная калекцыя, якая ўключае каля 2,5 тысячы штамаў мікраарганізмаў і каля 300 бактэрыяфагаў. На аснове гэтай калекцыі адбываецца адбор, далей праводзяцца генетычныя, мікрабіялагічныя і біяхімічныя даследаванні. Мы маем магчымасць атрымліваць такія віды прадукцыі, як смятана, тварог, сыры, ёгурты. Працуем практычна з усімі малочнымі прадпрыемствамі, таксама пастаўляем нашу прадукцыю на экспарт, пераважна ў Расію. У нас ужо ёсць тры контрагенты, і доля экспарту пастаянна расце. Мы бачым вялікія перспектывы на расійскім рынку», — адзначыў дырэктар інстытута.

Акрамя таго, многія віды прадукцыі ўстановы прайшлі клінічныя выпрабаванні. Заяўленыя распрацоўшчыкамі ўнікальныя медыцынскія або прафілактычныя ўласцівасці знайшлі сваё практычнае пацвярджэнне.

Апроч іншага, малочнакіслыя мікраарганізмы знайшлі прымяненне ў сельскай гаспадарцы пры нарыхтоўцы кармоў. Яны дапамагаюць стрымліваць распаўсюджванне цвілі. «Біякансервант для сіласавання набірае папулярнасць, мы нарошчваем вытворчасць.



Сёлета ў нас будуць рэкордныя продажы», — падкрэсліў Гардзей Гусакоў.

Асаблівая ўвага ўдзяляецца харчаванню беларускіх палярнікаў — удзельнікаў антарктычных экспедыцый. Для суровых умоў Антарктыды распрацоўваецца адмысловы рацыён. «Мы даём ім з сабой нашу закваску, яны бяруць сухое малако, сухія вяршкі і могуць выраблядь у тых умовах ёгурты, смятану, тварог і іншыя ферментаваныя малочныя прадукты», — дадаў Гардзей Гусакоў.

## КЛЕТАЧНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ І ВІРУСАЛОГІЯ

**Дырэктар Інстытута біяфізікі і клетачнай інжынерыі НАН Андрэй ГАНЧАРОЎ** расказаў аб распрацоўках у галіне клетачных тэхналогій і прымяненні ствалавых клетак.

Пад клетачнымі тэхналогіямі маецца на ўвазе выкарыстанне клетак чалавека для лячэння розных захворванняў. Сёння навукоўцы з усяго свету робяць стаўку ў тэрапіі на біямедыцынскі клетачны прадукт. Гэтым напрамкам інстытут і яго супрацоўнікі займаюцца з 2004 года. Ужо ў 2008 годзе былі арганізаваны першыя клінічныя выпрабаванні дэндрытных клетак для лячэння гепатыту B. На сёння інстытутам распрацавана больш за 20 метадаў лячэння розных цяжкіх захворванняў, распрацаваны і зарэгістраваны сем біямедыцынскіх клетачных прадуктаў (усяго ў краіне іх 14). «Так што можна сказаць, што наш інстытут адназначна займае ў гэтым напрамку лідзіруючыя пазіцыі», — падкрэсліў Андрэй Ганчароў.

Мезенхімальныя ствалавыя клеткі выкарыстоўваюцца пры лячэнні трафічных язваў, апёкаў скуры, аўтаімунных захворванняў (напрыклад сістэмнай чырвонай ваўчанкі), ковідных пнеўманій, стэнозаў трахеі і гартані. А дэндрытныя клеткі актыўна прымяняюцца для лячэння анказахворванняў. «На сёння ў большасці нашых пацыентаў зафіксаваны добры клінічны эфект. Найбольшая іх колькасць (75 чалавек) мела рак падстраўнікавай залозы. Мы ўжо можам прапічыць трох-пяцігадовую выжывальнасць такіх пацыентаў, і яна ўдвая вышэйшая, чым у тых, каго лячылі стандартнымі метадамі. Аднак для шырокага ўкаранення, уключэння клетачнай тэрапіі ў пратаколы лячэння, гэтага пакуль недастаткова, мы набіраем яшчэ больш пацыентаў. І пры атрыманні такіх жа даных на вялікай выбарцы будзем адназначна рэкамендаваць Міністэрству аховы здароўя ўключыць нашы метады лячэння ў пратаколы», — падзяліўся планамі Андрэй Ганчароў.

Інстытут не стаіць на месцы, і цяпер сумесна з арганізацыямі аховы здароўя праводзяцца 11 клінічных выпрабаванняў. «Гэта самыя новыя клетачныя прадукты, у тым ліку і зусім унікальныя не толькі для краіны, але і для свету. Яны прызначаны для лячэння самага шырокага спектра захворванняў, у тым ліку анкалагічных (раку нырак, мачавога пузыра, тоўстага кішэчніка), захворванняў сятчаткі, аўтаімунных захворванняў (цукровага дыябету першага тыпу, сістэмнага склерозу), алапецыі, — адзначыў кіраўнік інстытута. — У нас маецца сваё амбулаторнае аддзяленне клетачнай тэрапіі, дзе спецыялісты могуць лячыць пацыентаў, ёсць ліцэнзія на медыцынскую дзейнасць па самых розных напрамках».

Новы надзвычай важны напрамак — вірусалогія і распрацоўка вакцын супраць актуальных інфекцыйных захворванняў. У адпаведнасці з распараджэннем кіраўніка дзяржавы на працягу апошніх паўтара года праводзілася рэканструкцыя Цэнтра вірусалогіі, яго аснашчэнне абсталяваннем. На сёння ўсе работы завершаны, цэнтр гатовы да адкрыцця, якое адбудзецца ў найбліжэйшы час. Яго дзейнасць будзе накіравана, у першую чаргу, на распрацоўку метадаў дыягностыкі, лячэння і стварэнне самых розных вакцын. Над гэтым будзе працаваць міждысцыплінарны навуковы калектыў: спецыялісты ў вірусалогіі, імуналогіі, біятэхналогіях і біяхіміі.

Андрэй Ганчароў падкрэсліў: «Пандэмія COVID-19, якая прайшла, — далёка не самы горшы варыянт. Існуе велізарная колькасць іншых вірусаў, якія здольныя нанесці яшчэ большую шкоду. Вірусы трэба даследаваць і стварыць супраць іх сродкі для прафілактыкі. Толькі маючы ў краіне такі цэнтр, які ў самыя кароткія тэрміны здольны распрацаваць вакцыну супраць любой інфекцыі, можна забяспечыць інфекцыйную бяспеку краіны».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Мільёны амерыканцаў вымушаны заставацца дома з-за дыму



Школы адмянілі мерапрыемствы на свежым паветры, авіязносіны запаволіліся. Адбылося гэта з-за таго, што дым ад лясных пажараў у Канадзе ссунуўся на поўдзень, ахінуўшы гарады густой жоўтай смугой. Заслона дыму зацягнула і Нью-Ёрк. Аб гэтым паведаміла Reuters. Нацыянальная метэаралагічная служба ЗША выпусціла папярэджанне аб забруджванні паветра практычна для ўсяго Атлантычнага ўзбярэжжа. Прадстаўнікі органаў аховы здароўя заявілі, што знаходжанне на адкрытым паветры можа выклікаць праблемы з дыханнем з-за высокага ўзроўню дробных часцінак у атмасферы. Амерыканская прыватная служба прагнозаў AccuWeather паведаміла, што густы дым, які распаўсюджваецца ад вялікіх вышынь да ўзроўню зямлі, стаў самым значным задымленнем, што ахапіла паўночны ўсход ЗША, за больш чым 20 гадоў. Губернатар Нью-Ёрка Кэці Хокул назвала сітуацыю «надзвычайным крызісам», заявіўшы, што індэкс забруджвання паветра ў некаторых частках яе штата ў восем разоў перавышае норму. «Гэта настолькі інтэнсіўна, што можна падумаць, што лясны пажар адбываецца проста за ракой, а не ў Канадзе», — адзначаюць відавочцы. Паводле даных AccuWeather, дрэнная якасць паветра ў рэгіёне, верагодна, захаваецца і ў выхадныя.

## Кошт індыйскіх брэндаў наблізіўся да $2 трлн




**17.00, 18.50** Серыял «Без права на памылку» (16+).



**20.40** Маст. фільм «Брат» (16+).
**22.20** Маст. фільм «Непаслушнік» (16+).
**0.20** Маст. фільм «Успомніць усё» (18+).
**2.10** Маст. фільм «Начны прадавец» (16+).



**3.40** Маст. фільм «Хлопец з нашых магілак» (12+).
**5.10** Дак. фільм «90-я. Чорны гумар» (16+).

*У праграме магчымыя змяненні.*
*Перадрукоўка праграмы забароненая.*
*[СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.*

## Беларусь 1

**6.20 Меладрама «Н携родная» (16+).**
8.05 Існасць.
8.30 Сэнс жыцця (12+).
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.15 «Добрай раніцы, Беларусь!» са Святланай Бароўскай» (12+).
10.05 Здароўе (12+)
10.55 Дача (12+).
11.25 Таямніцы следства (12+).
**12.15 Меладрама «Сын майго бацькі» (16+).**
14.00 «100 пытанняў даросламу» (12+).
15.15 Краіна.
15.45 Пра гульні.
16.05 Гісторыі выратавання (12+).
**16.40, 19.25 Меладрама «Доктар Улітка» (12+).**
19.00 Пытанне нумар адзін.
21.00 Панарама.
21.40 Беларусь стваральная (12+).
21.50 Спецыяльны рэпартаж АТН (12+).
**22.05 Меладрама «Заходы і світанкі» (12+).**
1.30 Дзень спорту.

## Беларусь 2

6.00 «Уключайся. Найлепшае за тыдзень» (12+).
9.00 «Зразумець. Даравацъ». Дак. драма (16+).
9.55, 19.45 Тэлебарометр.
10.00 Мультсерыял «Таямніцы Мядовай даліны» (6+).
10.15 Мультсерыял «Маша і Мядзведзь» (0+).
10.30 «Гензель, Грэтэль і Агенцтва Магіі» (6+).
12.05 «Вежа. Маладзёжная будоўля» (12+).
12.50 «Бітва сватоў» (16+).
14.00 «Камень, нажніцы, папера» (16+).
**14.30 Меладрама «Апусканне» (16+).**
**16.20 Дэтэктыў «Смерць на move кветак» (16+).**
19.50 «Чатыры дачы» (16+).
21.10 Спартлато 6 з 49, КЕНА.
**21.15 Драма «Ляўша» (16+).**
**23.20 Роўд-муві «Лулу і Брыгс» (12+).**

## Беларусь 3

7.35 «Сіла веры».
8.00 «Архітэктура Беларусі».
8.15, 15.10 «Навіны культуры».
**8.25 «Застава ў гарах». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
10.05, 23.00 «Новыя людзі».
10.30 «Беларуская кухня» [СЦ].
11.00 «То!Лато».
11.30 «Навука побач» (6+).
**11.55 «Адвакат Ардашаў». Маст. фільм (16+) [СЦ].**
15.20 «Сваімі словамі».
**16.00 «Кожны дзень доктара Калліннікавай». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
17.30 «Кадры жыцця».
18.20 «Жывая спадчына».
**18.50 «Зямля Саннікава». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
20.25 «Суразмоўцы».
20.40 «Калыханка» (0+).
21.00 Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі «Маладзечна-2023».
23.25 «Люблю і памятаю».

## Беларусь 5

7.00 Піт-стоп.
7.15 Змешаныя адзінаборствы.
8.50 Хакей на траве. Чэмпіянат Беларусі. Жанчыны.
10.15 Вялікі спорт.
11.00, 21.30 Баскетбол 3х3. Нацыянальны чэмпіянат.
15.05 Хачу стаць...
15.35 Танцавальны спорт. Чэмпіянат Беларусі.
17.30 Планета спорту.
17.50 Хакей на траве. Чэмпіянат Беларусі. Мужчыны. «Будаўнік» (Брэст) — ХК «Мінск». У перапынку — «Спорт-цэнтр».
19.20 Футбол. Чэмпіянат Іспаніі.
21.20 Спорт-цэнтр.

## АНТ

7.00, 9.00, 16.00 Нашы навіны.
7.10 «Маркаў. Нічога асабістага» (16+).
8.00, 9.10 «Наша раніца ў суботу».
10.00 «Беларуская SUPER-жанчына» (12+).
10.10 «Трывожная кнопка» (16+).
10.40 «Белыя росы» (12+).
11.10 «Маё роднае. Медыцына» (12+).
**12.00 Фільм «Не можа быць!» (12+)**
**13.55, 16.20 «Асабістае жыццё следчага Савельева». Фільм (16+).**
18.20 Канцэрт Паліны Гагарынай «Назаўжды» (12+).
20.00 «Як глядзецъ».
20.45 «Метэагід».
21.10 «Сёння вечарам» (16+).
**22.45 Фільм «Лішні» (12+).**

## СТБ

6.10 Дак. праект. Хронікі маскоўскага побыту (16+).
7.30 «Анфас».
7.50 «Праверана на сабе. Жаночы погляд».
8.00 «Цэнтральны рэгіён».
8.30 «Карпаў». Серыял (16+).
**10.00, 12.10, 13.45, 16.45, 20.30 «Надзвычайная сітуацыя». Серыял (16+).**
10.30, 13.30, 16.30, 19.30 Навіны «24 гадзіны».
10.40 «Мінск і мінчане».
11.10 «Народны кантроль».
11.25 «У пошуках ісціны. Чароўная пілюля».
20.25 «СТБ-спорт».
**22.55 «Мечаны». Серыял (16+).**

## МІР

5.00, 6.15, 9.10, 2.15 Мультфільмы (6+).
6.00 «Усё, як у людзей» (6+).
**6.35 Маст. фільм «Апякун» (12+).**
8.05, 0.35 «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (12+).
8.40 «Гістарычны дэтэктыў з Мікалаем Валуевым» (12+).
9.30 «ФазэндаЛайф» (6+).
10.00 Надвор'е ў свеце.
**10.10 Маст. фільм «Непапраўны лгун» (6+).**
**11.40 Маст. фільм «Вас чакае грамадзянка Ніканорава» (12+).**
**13.25, 16.15, 18.45 Серыял «Два лёсы» (16+).**
16.00, 18.30 Навіны (бягучы радок).
**23.00 Маст. фільм «Формула кахання» (0+).**

## РТР—Беларусь

7.05 «Новая раніца».
9.30 «Тайны Беларусі» (16+).
10.30 «Дакрананне».
10.45 «Зямля памяці».
11.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30, 21.00 Беларусь. Навіны.
11.40 «Сімвалы беларускай вечнасці».
**11.55 Фільм «Урачэбная памылка» (12+).**
**15.35, 17.45 Фільм «Дарую за каханне» (12+).**
19.45 «Плюс-мінус».
21.30 «Прывітанне, Андрэй!» (12+)
**23.20 Фільм «Сіндром адкладзенага шчасця» (16+).**

## НТБ—Беларусь

6.00 «Астрапрагноз».
6.05, 7.10 Сёння. Галоўнае.
6.15 Азбука спорту.
6.25 «На тыдзень» (16+)
7.25 «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
8.00, 10.00, 16.00 Сёння.
8.20 «НЗ.by: час вынікаў».
8.50 «Проста і смачна» (6+).
9.25 «Урачэбныя таямніцы плюс» (12+).
10.20 Знак якасці (6+).
10.40 «Галоўная дарога» (16+).
11.15 «Жывая ежа з Сяргеем Малазёмавым» (12+).
12.05 Кватэрнае пытанне (0+).
13.05 «Паедзем, паядзім!» (0+)
**14.05 Серыял «Трымайся за аблокі» (12+).**
16.20 «Следства вялі...» (16+)
17.10 «Сакрэт на мільён» (16+).
19.00 «Цэнтральнае тэлебачанне».
20.15 «Заснавана на рэальных падзеях» (16+).
**23.10 Баявік «Дванаццаць гадзін» (16+).**

## 8 канал

7.00, 14.35, 18.55, 21.00 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05 Мультпарад (0+).
8.30 «Любімае кіно».
10.00 «Паляванне і рыбалка».
**10.25 Прыгоды «Парк Юрскага перыяду» (12+).**
**12.30 Баявік «Джэймс Бонд — агент 007. І цэлага свету мала» (12+).**
**14.40 Прыгоды «Думкі аб свабодзе» (12+).**
**16.25 Фантастыка «Ізгой-1. Зорныя войны» (12+).**
18.45 «Асалам алейкум, Беларусь!»
**19.00 Дэтэктыў «Шостае пачуццё» (12+).**
20.50 «Вечарніца» (0+).
21.05 «Фэшн is my прафэшн» (12+).
**21.15 Драма «Апалон 13» (12+).**
**23.20 Камедыя «Эвалюцыя» (16+).**
**1.00 Фантастыка «Ціхаакіянская мяжа» (12+).**
3.10 Перапынак у вяшчанні.



## Культура

6.30, 7.00, 7.30, 10.00, 12.30, 17.00, 19.30 Навіны культуры.
6.35 «Пешшу...»
7.05 Легенды сусветнага кіно.
7.35, 13.45, 1.05 Прыступкі цывілізацыі [СЦ].
8.30 «Жыццё і лёс» [СЦ].
8.50, 15.50 «У пошуках капітана Гранта». Маст. фільм.



10.15 «Назіральнік».
11.15, 0.00 ХХ стагоддзе.
12.20 Колер часу.
12.45 Навіны. Падрабязна. Кнігі.
13.00 «Гульня ў бісер»
14.40, 2.40 «Забытае рамяство». Дак. серыял.
14.55 Лінія жыцця [СЦ].
17.15 «Перадзвіжнікі. Мікалай Ярашэнка».
17.45, 2.00 Выдатныя дырыжоры ХХ стагоддзя.
18.30 «Растоў-на-Доне. Асабнякі Парамонавых». Дак. фільм.
19.00 «Почырк эпохі» [СЦ].
19.45 «Галоўная роля».
20.05 «Семінар».
20.45 «Добрай ночы, малыя!»
21.00 Штучны адбор.
21.40 «Белая студыя».
22.25 «Макараў». Маст. фільм.

## Настальгія

6.00 Маст. фільм «Варатар» (12+).
7.10, 9.40, 11.30, 13.00, 14.50, 15.40, 17.30, 19.10, 20.45, 21.40, 23.30, 1.30, 5.30 Музычная настальгія (12+).
7.25 Музычны м/ф «Няхай гавораць» (12+).
9.00, 15.00, 21.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 22.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР» (12+).
12.00 «СевАлогія» (18+).
13.10 Маст. фільм «Разлічымся пасля смерці» (16+).
17.00, 23.00, 5.00 «Блефклуб» (16+).
18.00, 3.00 «Быў час» (16+).
19.25 Маст. фільм «Начны кашмар» (16+).



0.00 Маст. фільм «Аршын Мал Алан» (12+).
1.40 Маст. фільм «Ямачкі» (16+).

## EuroSport 1

3.15, 5.30, 6.30, 9.30, 10.30, 18.30, 2.30 Маўнцінбайк (6+).
4.00, 7.30, 11.30, 20.00, 23.00 Тэніс (6+).
13.30, 22.00 Аўтагонкі на вынослівасць (6+).
14.35, 15.30, 17.00, 19.30 Веласпорт (6+).
21.00 Спідвей (6+).
1.00 Скалалажанне (0+).

## Кінакамедыя

2.05 «Шоу Трумана» (6+).
4.30 «Невынішчальны шпіён» (16+).
6.00 «Новыя прыгоды Аладзіна» (6+).
7.55 «Дзікая штучка» (16+).
9.45 «Сабрына» (12+).



12.10 «Красуні на ўцёках» (16+).
13.45 «Пенелопа» (12+).
15.40 «За бортам» (12+).
17.45 «Без тармазоў» (16+).
19.30 «Вельмі дрэнная настаўніца» (18+).
21.10 «Дзевяць ярдаў-2» (16+).
23.00 «Адчыніце, паліцыя!-3» (12+).

## ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
9.15 «Старац» (16+).
10.15, 17.50 «Сны» (16+).
11.10 «Паглядзім» (12+).
11.45 «Містычныя гісторыі» (16+).



13.25, 18.45, 2.50 «Сляпая» (16+).
14.50, 20.10, 3.40 «Варажбітка» (16+).
16.10, 21.35 «Ганна і таямніца мінулага» (16+).
23.15 «Грым» (16+).
0.05 «Дзённік экстрасэнса» (16+).
1.00 «Планета малпаў» (16+).
4.30 «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).

## ТБ1000

5.30, 1.30 Еш, маліся, кахай (16+).
7.40, 3.45 Улюбёнцы Амерыкі (16+).
9.30 Даспехі Бога (16+).



11.05 Даспехі Бога-2: аперацыя «Кондар» (16+).
13.00 Даспехі Бога-3: місія «Задыяк» (6+).
15.10 Даспехі Бога: у пошуках скарбаў (12+).
17.00, 17.50 Каханне, розум, помста (16+).
18.40 Куды прыводзяць мары (12+).
20.45 Двухсотгадовы чалавек (6+).
23.05 Капітан Крук (12+).

## ТБ1000 Рускае кіно

5.30 Смяшарыкі (6+).
6.15 Чуч-Мявуч (6+).
7.05 Бода Барода (6+).



7.35 Адзін удых (12+).
9.15 Чэмпіён свету (6+).
11.55 Белы снег (6+).
14.10 Абарачальная рэальнасць (12+).
15.35 Мафія: гульня на выжыванне (16+).
17.15 Містар Накаўт (12+).
19.00 Бой з ценем (16+).



21.15 Бой з ценем-2: рэванш (16+).
23.40 Бой з ценем 3D: апошні раўнд (16+).
1.45 За гранню рэальнасці (12+).



3.25 Смяротныя ілюзіі (12+).
5.10 Як вожык і медзведзяня мянялі неба (12+).
5.20 Саламяны бычок (6+).

## National Geographic

6.00 Навуковыя глупствы (16+).
6.25, 7.10, 23.15 Надзвычайны доктар Пол (16+).
6.30, 9.30, 10.20, 14.50, 15.35 Дзікі тунец (16+).
7.55, 8.45, 17.50, 18.35, 20.10, 21.00, 21.45, 0.00, 0.50, 2.25, 3.10 Аўта-SOS (16+).
11.05, 11.50, 16.20, 17.05, 19.20, 22.35, 3.55, 4.40 Расследаванні авіякатастроф (16+).
12.35, 5.25 Непакорны востраў (16+).
13.20, 1.35 Ліхтугі за мяжой (16+).
14.05 Еўропа з вышыні птушынага палёту (16+).

## ЯСНАе

4.30 Серыял «Гетэры маёра Сакалова» (16+).
6.10 Маст. фільм «Сляды на вадзе» (12+).



7.50 «У адкрытым доступе».
8.20 Серыял «Участак лейтэнанта Качуры» (16+).
10.05 Маст. фільм «Палымя» (12+).
12.35 Серыял «Па законах ваеннага часу-2» (16+).
14.20 Серыял «Радзіма чакае» (16+).
16.10 Серыял «Афіцэры-2» (12+).
17.55 Маст. фільм «Рысь» (16+).
19.30 Серыял «Танкіст» (12+).
21.00 «Ясна аб міні-футболе».
21.30 Маст. фільм «У пошуках прыгод» (12+).
23.05 Дак. фільм «90-я. Рытуальны Кландайк» (16+).
23.50 Маст. фільм «Братка» (12+).
1.10 Маст. фільм «Міравы хлопец» (12+).
2.30 Серыял «Ваенная разведка: першы ўдар» (16+).

*У праграме магчымыя змяненні. Перадрукоўка праграмы забароненая. [СЦ] – фільм трансліруецца са скрытымі субцітрамі.*

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.25** Зона Х (16+).
**9.10** «Здарова здаровым быць!» (6+)
**9.55, 11.45, 12.15, 13.05 Меладрама «Вялікае неба» (12+).**
**10.50, 1.00** «Скажынемаўчы».
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**15.25, 22.20 Серыял «След» (16+).**
**17.05** Беларуская часінка.
**18.30, 19.20 Меладрама «Напярэдадні дзень» (16+).**
**21.00** Панарама.
**21.45** Беларуская супержанчына.
**21.55** Адзін дзень (12+).
**0.10** Сфера інтарэсаў.
**0.45** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» Ранішняе шоу (12+).
**10.00, 16.55** Тэлебарометр.
**10.05, 18.35** «Сляпая» (16+).
**10.35, 19.00** «Знакі лёсу». Дак. драма (16+).
**11.05, 17.00 Дэтэктыў «Моцныя арэшкі» (16+).**
**12.35, 20.45, 21.20 Серыял «Практыка» (12+).**
**14.30, 19.30 Серыял «Алег» (16+).**
**15.45** Мультсерыял «Прастаквашына» (6+).
**15.55** Нічога сабе ньюз (12+).
**16.00** «ПІН_КОД» (12+).
**21.10** Спартлато 6 з 49, КЕНА.
**23.00** «Гастратур» (16+).
**23.55** «На тыдзень» (16+).

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.30** «Беларуская кухня».
**8.05, 13.00, 16.45, 20.30, 23.20** «Навіны культуры».
**8.15, 18.45 «Чорная кошка». Маст. фільм (16+) [СЦ].**
**9.55, 21.05** «Дыверсанты». Дак. фільм (16+).
**10.40, 17.25 «Варыянт «Амега». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**12.00** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
**13.10, 21.50 «Законны шлюб». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**14.40** «Кадры жыцця».
**16.55** «Жывая спадчына».
**20.40** «Калыханка» (0+).
**23.30** «Кампазітары Беларусі».

## Беларусь 5

**7.00** Сняданак чэмпіёна.
**7.30** Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі.
**9.30** Між іншым.
**9.50** Змешаныя адзінаборствы.
**13.00** Хачу стаць...
**13.30** Пляжны футбол. Чэмпіянат Беларусі.
**16.00** Піт-стоп.
**16.20** Футбол. Таварыскі матч. Беларусь (U-21) — Расія (U-20). У перапынку — «Спорт-цэнтр».
**18.20** Хакей на траве. Чэмпіянат Беларусі. Жанчыны. Фінал. У перапынку — «Спорт-цэнтр».
**19.50** Спорт-цэнтр.
**20.00** Футбол. Чэмпіянат Іспаніі.
**21.55** Фактар сілы.
**22.25** Футбол. Чэмпіянат Расіі.

## АНТ

**6.00, 7.15, 8.15, 9.10** «Наша раніца».
**7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**7.10, 8.10** «Трывожная кнопка» (16+).
**10.00** «Жыць здарова!» (16+)
**11.15** «Бесталковыя нататкі» (12+).
**11.35, 13.15 Фільм «Прыгожае жыццё» (16+).**
**13.50, 23.15 Фільм «Жэмчугі» (16+).**
**16.20** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**17.20, 18.20** Інфармацыйны канал (16+).
**19.00** «Лялькі спадчынніка Туткі» (16+).
**20.10** Вячэрнія навіны.
**21.15** «Маркаў. Нічога асабістага» (16+).
**22.00 Фільм «Доктар Ганна» (16+).**
**1.15** Час.

## СТБ

**6.00, 6.40, 7.45, 8.40** «Раніца СТБ».
**6.30, 7.30, 8.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00** Дак. праект. Без падману (16+).
**10.40 «Карпаў». Серыял (16+).**
**11.30** Дак. праект. Знак якасці (16+).
**13.55 «Надзвычайная сітуацыя». Серыял (16+).**
**16.50 «Лягавы». Серыял (16+).**
**20.15, 23.05** «СТБ-спорт».
**20.20** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.30** «Міншчына».
**20.40** «Беларуская супержанчына».
**20.50 «Мечаны». Серыял (16+).**
**23.10** Дак. праект. Закулісныя войны (16+).
**0.30 «Жураў». Серыял (16+).**

## МІР

**5.00, 10.10 Маст. фільм «Міхайла Ламаносаў» (12+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 18.30** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**14.10, 16.15** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.35** «Міравое пагадненне» (16+).
**18.50** «Гульня ў кіно» (12+).
**22.15, 2.45 Серыял «Вострая непатрэбных людзей» (16+).**
**1.40** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**2.05** «Гульня ў словы» (6+).

## РТР—Беларусь

**6.00** «Новая раніца».
**10.00, 11.30, 14.30, 17.30, 21.00, 23.00** Беларусь. Навіны.
**10.05** Тэлесерыял.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Так! Але...»
**12.20** «Пра самае галоўнае» (12+).
**13.00** «Кропкі над і» (16+).
**14.40** «60 хвілін».
**17.40 Серыял «Маскоўская борздая-2» (16+).**
**18.50** «Малахаў» (16+).
**21.30, 23.15 Серыял «Валюша» (12+).**
**0.15** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

## НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.15, 8.20, 13.25, 16.45, 19.55, 22.25, 23.30** Сёння. Галоўнае.
**6.10** «Здарова здаровым быць!» (6+)
**6.55** Сфера інтарэсаў.
**7.30** Гісторыі выратавання (12+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.35, 21.10** «НЗ.by».
**8.55, 10.35 Баявік «Марскія д'яблы. Асаблівае заданне» (16+).**
**11.15 Серыял «Пляж» (16+).**
**13.30** Надзвычайнае здарэнне.
**14.00 Серыял «Маска. Тры вакзалы» (16+).**
**16.50** «За гранню» (16+).
**18.00** «ДНК» (16+).
**20.10, 21.30 Серыял «Эфект даміно» (16+).**
**22.30, 23.45 Серыял «Рэалізацыя» (16+).**

## 8 канал

**7.00, 17.00, 19.05, 21.15** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05** Мультпарад (0+).
**7.30** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35 Камедыя «Кобра Кай» (12+).**
**9.05** «Вакол свету».
**9.55 Драма «Каралева змей» (16+).**
**10.50 Драма «Заложнікі кахання» (16+).**
**12.25 Серыял «Яна напісала забойства» (12+).**
**13.10 Драма «Басейн» (16+).**



**15.30** «Рэтраспектыва».
**17.05 Фэнтэзі «Хлопчык з аленевымі рагамі» (12+).**
**18.05 Камедыя «Я прыехаў» (16+).**
**19.10 Драма «Схватка» (16+).**
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.00** «Асалам алейкум, Беларусь!»
**21.10** «Урокі Лазуркіна».
**21.20 Дэтэктыў «Выпрабаванне невінаватасцю» (16+).**
**0.20 Баявік «Аперацыя «Фартуна». Майстэрства перамагаць» (16+).**
**2.12 Камедыя «Бурацкі квэст» (16+).**
**3.30** Перапынак у вяшчанні.



## Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 10.00, 12.30, 17.00, 19.30** Навіны культуры.
**6.35** «Пешшу...»
**7.05** Легенды сусветнага кіно.
**7.35, 13.45, 0.30** Прыступкі цывілізацыі [СЦ].
**8.30** «Жыццё і лёс».
**8.50, 15.50** «У пошуках капітана Гранта». Маст. фільм [СЦ].
**10.15** «Назіральнік».
**11.15, 23.35** ХХ стагоддзе.
**12.10** «Першыя ў свеце». Дак. серыял.
**12.45** Навіны. Падрабязна. Тэатр.
**13.00** «Абсалютны слых».
**14.40** «Забытае рамяство». Дак. серыял.
**14.55** Лінія жыцця [СЦ].
**17.15** Пернікавы домік. «Беламорскія ўзоры» [СЦ].
**17.45, 1.25** Выдатныя дырыжоры ХХ стагоддзя.
**18.45** Колер часу.
**19.00** «Почырк эпохі» [СЦ].



**19.45** «Галоўная роля».
**20.05** «Семінар».
**20.45** «Добрай ночы, малыя!»
**21.00** «12 крэслаў». Трымайце гросмайстра!» Дак. фільм.
**21.40** «Энігма. Уладзіслаў Сулімскі».
**22.25** «Запомніце мяне такой». Маст. фільм.
**2.25** Раман у камені.

## Настальгія

**6.00** «Быў час» (16+).
**7.10, 8.45, 9.40, 11.30, 14.40, 15.40, 17.30, 21.40, 1.00, 2.50, 3.40, 5.30** Музычная настальгія (12+).
**7.25** Маст. фільм «Начны кашмар» (16+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**11.00, 17.00, 23.00, 5.00** «Блеф-клуб» (16+).
**12.00** «Спяем, сябры!» (12+)
**13.00** Маст. фільм «Бандыт, які цалуецца» (16+).
**18.00** «Яловая субмарына» (18+).
**19.10** Маст. фільм «Якія спяваюць пад дажджом» (16+).
**0.00** «СевАлогія» (18+).
**1.10** Маст. фільм «Разлічымся пасля смерці» (16+).

## EuroSport 1

**3.15, 5.30, 6.30, 9.35, 10.30, 13.00, 14.00, 16.00, 23.00, 0.00, 2.30** Веласпорт (6+).
**4.00, 11.30, 20.30, 1.00** Скалалажанне (0+).
**7.30** Тэніс (6+).
**18.30** Парусны спорт.

## Кінакамедыя

**1.20** «Адчыніце, паліцыя!-3» (12+).
**3.45** «Тэрмінова выйду замуж» (16+).



**5.50** «Сабрына» (12+).
**8.15** «Ноч у Роксберы» (18+).
**9.45** «Пенелопа» (12+).



**11.40** «За бортам» (12+).
**13.45** «Самы лепшы фільм-2» (16+).
**15.20** «Самы лепшы фільм 3-Дэ» (18+).
**17.15** «Яшчэ па адной» (18+).
**19.30** «Шпіёны па суседстве» (16+).



**21.25** «Белыя цыпачкі» (12+).
**23.20** «План Б» (16+).

## ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**9.05** «Старац» (16+).
**10.05, 17.50** «Сны» (16+).
**11.00** «Пагляджім» (12+).
**11.30** «Містычныя гісторыі» (16+).
**13.10, 18.45, 3.40** «Сляпая» (16+).
**14.40, 20.10** «Варажбіт-ка» (16+).
**16.10, 21.35** «Ганна і таямніца ночы» (16+).
**23.15** «Грым» (16+).
**0.10** «Дзённік экстрасэнса» (16+).
**1.05** «Аўстралія» (16+).
**4.30** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).

## ТБ1000

**5.30** Шанхайскія рыцары (12+).
**7.25** Даспехі Бога (16+).
**9.05** Даспехі Бога-2: аперацыя «Кондар» (16+).



**11.05** Забароненае царства (16+).
**12.55, 0.50** Усё ці нічога (16+).
**14.55** Прыкіньса маёй жонкай (16+).



**17.00, 17.50** Каханне, розум, помста (16+).
**18.40** Назад у будучыню (12+).



**20.50** Назад у будучыню II (12+).
**22.45** Назад у будучыню III (12+).
**2.40** Джэры Магуаер (16+).
**4.50** Забароненае царства (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**5.30** Смяшарыкі (6+).
**6.10** Чуч-Мявуч (6+).
**7.00** Бода Барода (6+).
**7.20** Халоп (12+).
**9.10, 2.10** Гуляй, Вася! (16+)



**10.50, 0.25** Гуляй, Вася!
Спатканне на Балі (16+).
**12.45** Адзін удых (12+).
**14.30** Белы снег (6+).
**16.50** Адзінаццаць маўклівых мужчын (12+).
**19.00** Леў Яшын. Варатар маёй мары (6+).



**21.05** Скрынка (12+).
**22.55** Нефутбол (12+).
**3.45** Дзікая (16+).

## National Geographic

**6.00, 5.55** Навуковыя глупствы (16+).
**6.20, 9.30, 10.20, 14.10, 14.55, 15.40, 19.25** Дзікі тунец (16+).
**6.25, 7.10, 23.10** Надзвычайны доктар Пол (16+).
**7.55, 8.45, 17.55, 18.40** Аўта-SOS (16+).
**11.05, 11.55, 16.25, 17.10, 22.30, 3.35, 4.20** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**12.40, 5.05** Непакорны вострaў (16+).
**13.25, 1.25** Ліхтугі за мяжой (16+).
**20.10, 23.55, 2.15** НЛА: даследаванне невядомага (16+).
**21.45, 0.40** Зляўцы кантрабандыста (16+).

## ЯСНАе

**5.10** Серыял «Застава Жыліна» (12+).
**6.45** Серыял «Апошні бранепоезд» (16+).
**8.35** «Ясна аб футболе».
**9.05** Серыял «Люты» (16+).
**10.55** Серыял «Чорны сабака» (12+).
**12.25** Серыял «Па законах ваеннага часу-2» (16+).
**14.10** Серыял «Танкіст» (12+).
**15.45** Серыял «САХР» (16+).
**17.25** Маст. фільм «Аб'яўлены ў вышук» (12+).
**19.15** Серыял «Крэпасць Бадабер» (16+).
**21.00** «У адкрытым доступе».
**21.30** Маст. фільм «Бумер» (16+).



**23.25** Дак. фільм «90-я. З новай Расіяй!» (16+)
**0.10** Маст. фільм «Сляды апосталаў» (12+).
**2.05** Маст. фільм «Белыя росы» (12+).
**3.30** Серыял «Ваенная разведка. Паўночны фронт» (16+).

*У праграме магчымыя змяненні.*
*Перадрукоўка праграмы забаронена.*
*[СЦ] – фільм трансліруецца са скрытымі субцітрамі.*




## ЛЯЧЭННЕ ШОПІНГАМ

Тацццяна — мая суседка — змалку зведала, пачым фунт ліха, але ж перад ім ніколі не пасавала, не здавалася: атрымала вышэйшую адукацыю і праз гады — якую-ніякую пасаду, двойчы схадзіла замуж і двойчы развялася, што цікава, — не страціўшы пры гэтым добрых адносін ні з адным, ні з другім мужам, ні з адной, ні з другой свякроўю... Таму дочкі Тацццяны — ад розных шлюбаў — ніколі не маглі сказаць, што раслі без бацькі, без увагі бабуль і дзядоў.

Іншымі словамі, і радні, і блізкіх людзей у суседкі шмат, але найбліжэйшая — мусіць, сястра. Яны з ёй — як дзве кроплі вады. І не толькі знешне. У абедзвюх, як той казаў, па шылу ў вядомым месцы: абедзвюм трэба ўсюды паспець і ўсё парабіць — дома, на рабоце, на дачах...

Ведаючы гэта, дзеці падрыхтавалі ім падарунак: адправілі ў санаторый, каб маглі адпачыць. Далей — са слоў Таццяны.

— Спачатку ўсё было па распарадку: мора, пляж, працэдуры, экскурсіі, вечарам — танцы.

Можа б, вось так і далей, але нам з сястрой стала сумна, бо гэта ж з глузду з'едзеш, калі нічога не рабіць!

«Тут блізка, — пачулі ад жанчын, — цэлая вуліца крамаў... І чаго ў іх толькі няма... Прычым — настолькі таннага ды патрэбнага!..»

Назаўтра ж мы пайшлі паглядзець, а ўбачыўшы, забыліся на ўсё: на экскурсіі, кіно, танцы... Лежакоў на пляжы больш не бралі, кавы не пілі, на прысмаках эканомілі... Кожны дзень хадзілі на шопінг: нешта выбіралі ды прыглядаліся-таргаваліся; кожны дзень вярталіся бадзёрымі і шчаслівымі, з поўнымі пакетамі рознай драбязы — для кухні, для дачы, для радні, для сяброў, для сваіх любімых коцікаў...

Праз нейкі тыдзень побач з нашымі чамаданамі з'явіліся чатыры (бо танныя і «дзве ў падарунак»!) паласатыя «чаўнакоўскія» сумкі. Праз два тыдні — яны сталі поўнымі, прычым усе.

З нумара мы з сястрой выцягвалі іх з рогатам, да месца збору падносілі па «схеме»: я пільную — Іра валачэ, потым мяняемся...

У аўтобус і цягнік наш багаж грузілі двое дужых мужчын.

...А ў Мінску сустракаў адзін — Віталь, муж Ірыны — з кветкамі, але, як выглядала, без радасці, асабліва потым, бо з вагона мы выходзілі самымі апошнімі, і ён (ведама, начальнік!) знерваваўся чакаць, а ўжо глядзець на нашы «торбы»...

Не дзіва, што, выгружаючы, ён адну з іх стукнуў. Маланка — па швах (якія грошы, такая і якасць), наша дабро — на асфальт і ўросып...

У беднага Віталя аж твар перакасіўся! Уручыў Ірыне букет (нам толькі яго не хапала!), даў грошай на таксі (сказаў, каб нанялі грузавое) і знік...

Але ж нам з сястрой не да крыўдаў было: пазбіралі з асфальту рэчы (добра, што пад цягнік лазіць не прыйшлося!), узялі таксі з самым вялікім багажнікам і паехалі да мяне — разгрузіліся.

Змесціва сумак разбіралі пазней: Ірына нешта раздавала дзецям, нешта адвозіла на дачу, дамоў... Факт, што яе Віталь да сёння думае, што гэта я такая барахольшчыца, што гэта мне ўсяго так трэба было.

Ну і няхай. Затое ў доме сястры — цішыня і спакой. Да таго ж — якая эканомія! Пасля паездкі ў санаторый мы з Ірынай надоўга забыліся дарогу ў гаспадарчыя крамы (нам нічога не трэба!), не шукалі і падарункаў-сувеніраў — яны былі «ў загашніку»! Ды што там — мы дагэтуль карыстаемся рэчамі, якія некалі, гадоў пятнаццаць таму, падбіралі з асфальту.

**Л. Міхалюк,**
*г. Мінск.*

## ЯШЧЭ РАЗ ПРА КАХАННЕ І... СВІНСТВА

Свой чарговы дзень нараджэння Валя, мая прыяцелька, вырашыла адзначыць на лецішчы, бо, па-першае, сяброў там не менш, чым у горадзе, а па-другое, — напярэдадні некалькі выхадных. Дык чаму б не правесці іх на прыродзе — і самім, і блізкім... Я, ва ўсякім разе, ехала туды з радасцю і — пахвалюся — з адмысловым падарункам: везла з сабой веселуна-гарманіста, знаючы, будзе сапраўднае свята.

Госці на яго паз'язджаліся загадзя. Сын гаспадыні тупаў каля мангала, сама яна ды іншыя жанчыны нешта раскладвалі па талерках ды зносілі на стол, а мужчыны — недзе сышлі і, што называецца, след прастыў.

— Лёня, сынок, патэлефануй бацьку, — папрасіла імянінніца. — Скажы, каб хутчэй вяртаўся...

— А на гэты раз ён паслухае? — засумняваўся чамусьці Лёня.

— Павінен, — засмяялася маці ды стала расказваць, як некалі даўно прывезла гэтага сынка з радзільні, як на першым месяцы жыцця яго даймалі колікі і малы заходзіўся плачам. А разам з ім — і маці... «Гэта пройдзе — перарасце. Ты меней з ім насіся», — раіў бацька. Яна ж лічыла, што дзіця трэба звазіць да доктара.

— Вечарам мы пагаварылі вось так, — успамінала Валя, — а раніцай Лёнічак зноў плача. Я за тэлефон і давай набіраць мужа (ён ужо пры пасадзе быў), каб па нас машыну прыслаў. Гудкі пачула, слухаўку побач з Лёнем кінула і кудысьці адвярнулася: трэба ж збіраць малога да доктара, апранацца самой, а машыны — усё няма і няма... «Ну чаму так доўга?!» — пытаюся ў мужа, калі той аб'явіўся... Кажа: «Раней — не мог: вельмі важная нарада. А пасля яе ў кабінет вярнуўся, — на стале запіска ляжыць: «Звонил ваш сын»... Адчуваеце — з першых тыдняў жыцця!

...Але ж на яго званкі бацька адгукнуўся не адразу: і тады, і цяпер: напіткі на стале ўжо трохі сагрэліся, калі ён (ды кампанія) урэшце з'явіліся, прычым — з вялікім пакункам. «Сюрпрыз», — папярэдзіў гаспадар.

І потым — ужо з шампанскім у руках — расказаў, як некалі не прыйшоў на Валіны 25, як яна пакрыўдзілася і некалькі месяцаў не размаўляла з ім... Аж пакуль не прызнаўся ў каханні і свінстве, не паклікаў дзяўчыну замуж і не падарыў ёй... сімпатычнае ружовае парася.

— Паглядзі, як яно падрасло! — выгукнуў гаспадар.

Мужчыны тут жа разгарнулі пакунак, і мы ўсе ахнулі, бо там быў ці не твор мастацтва — выразаны з дрэва... кабан.

— Калі ласка, прымі яго, — папрасіў імянінніцу муж. — Прымі — разам з маімі прабачэннямі за ўсе грахі, разам з удзячнасцю за пражытыя разам гады, разам з прызнаннем, што я кахаю цябе па-ранейшаму...

Вось такім нечаканым і прыгожым быў першы тост і многія наступныя. Мы вельмі хораша пасядзелі, прычым настолькі, што (не без таго), паўдня адпрацаваўшы, грошай з мяне гарманіст не ўзяў.

**А. Васільева,**
*г. Гомель.*

## ШУРА І ГІБІСКУС, альбо Не сілай, дык спосабам

Пра мезальянс (няроўны шлюб) гэтым дваім казалі адразу — і ў вочы, і за вочы. А яны — калгасны трактарыст Шура і настаўніца біялогіі Фаіна — хіба слухалі ды пасмейваліся, бо пажаніліся ды жылі ў любові і згодзе... Не без таго — было: часам трохі спрачаліся. І ў асноўным — з-за раслінасці, якую Фаіна, згодна са сваёй прафдзейнасцю і душэўнай схільнасцю, развяла ў такіх аб'ёмах, што пакоі ў доме сталі нагадваць аранжарэю, а пасля і зусім — трапічны зараснік. Гаспадара больш за ўсе хларафітумы чапляў вялізны кактус — з пляскатымі лістамі і доўгімі белымі валасінамі-калючкамі, на якія натыкаўся ў вітальні... Да таго дайшло, што нейк раз цярпенне лопнула: у гарачцы заявіў, што зверэ з яго ўсе рэчы і сыдзе ў лес. Маўляў, умовы там прыкладна тыя ж, а калоцца прыйдзецца менш...

Фаіна ў інстытуце вывучала псіхалогію і таму пайшла на кампраміс: добрую частку вазонаў перавезла да сябе ў школу. Але ж і тых, што засталіся, лічыць — не злічыш!

...Гэта была перадгісторыя, а вось яе саму трэба пачаць з таго, што Фаіне ў час летніх канікулаў прапанавалі пуцёўку ў санаторый, і яна — жанчына маладая ды статная, але ж не дужа здаровая — захацела паехаць. Муж — па характары досыць раўнівы — з гэткай жа сілай не хацеў яе адпускаць: пад гудзенне матора ў яго беднай галаве маляваліся такія карціны, што не чуў ну ніякіх довадаў!

Убачыўшы тое, Фаіна яшчэ раз пайшла на кампраміс: частку грошай, якія збіралі на новы спальны гарнітур, паабяцала аддаць мужу — на палатку і новыя вудачкі.

Рыбак у Шуравай душы аказаўся мацнейшы за раўніўца, і апошні адступіў: «Едзь, калі табе так трэба!»

— Але ў мяне ўмова: ты будзеш палівать гібіскус, — перад ад'ездам сказала Фаіна. — Ён вельмі дарагі. Не дай бог прападзе — ніякіх палатак ды вудачак.

— Добра, пальо... Няцяжка, — адмахнуўся Шура, не разумеючы, якую допусціў памылку.

...Баршчу ды катлет-галубцоў на час сваёй адсутнасці Фаіна нагатавала, дзяцей адвезла да бабулі. Шуру заставалася карміць свіней і курэй, даіць дзвюх коз ды палівать гэты самы... Ну як яго? Бі-гік-ус? А дзе ён? Каторы з вазонаў і як выглядае?

Пра інтэрнэт тады Шура не ведаў. На рабоце пра такую расліну ніхто не чуў, бо Шура, па-першае, няправільна прамаўляў назву, а па-другое, у вёсцы гэтае дрэўца называлася куды прасцей — кітайская ружа.

Мара пра палатку магла накрыцца тазікам і тады...

Спрацавала жончына тактыка: Шура праз дзень-другі стаў прыносіць у хату два вядры вады і — у «пошуках» гібіскусу — добрасумленна палівать усіх зялёных гадаванцаў, за выключэннем хіба альвасу, які памятаў з дзяцінства (ён рос у бабулі ў алюмініевым гаршчку) і злашчаснага кактуса. Аднак за іх Фаіна не хвалявалася: для «мексіканцаў» два тыдні без вады — нават на карысць.

...Незабыўны дзядуля Крылоў пісаў: «Где силой взять нельзя, там надобна ухватка». Нашы продкі тую ж думку выказалі карацей: «Не сілай, дык спосабам».

**А. Навасельская,**
*Мінскі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

Неасабісты суб'ектыў



# У пошуках пакуль не страчанага

## Што ляжыць у бабуліным серванце

За свае амаль сто шэсць гадоў існавання «Звязда» неаднойчы дапамагала людзям знаходзіць адно аднаго. Варта пагартаць падшыўкі, каб у гэтым пераканацца. Знаходзіліся дзеці, згубленыя ў мітусні эвакуацыі, знаходзіліся ветэраны-аднапалчане, знаходзіліся браты і сёстры, раскіданыя па розных дзіцячых дамах. Знаходзіліся — ужо ў 90-х, сваякі за мяжой (ваша пакорная слуга сама дапамагла знайсці бабулі з Быхава сына ў далёкай Канадзе, але гэта асобная і зусім невясёлая гісторыя). Знаходзіліся пары — на працягу многіх гадоў «Звязда» друкавала аб'явы ў рубрыцы «Жадаю пазнаёміцца». Адны з яе герояў, якія дзякуючы газеце пабраліся шлюбам, запрасілі журналістаў у госці ў далёкую палескую вёску Дзівін, і тое была адна з самых цікавых і запамінальных камандзіровак у жыцці.

Пра ўсё гэта з адценнем трохі нават шкадавання пішу ў прошлым часе, бо цяпер, калі ўсюды пануюць яго вялікасць інтэрнэт і сацыяльныя сеткі, у газеты амаль няма шанцаў стаць платформай для такіх пошукаў і знаходак. «Амаль», бо літаральна ў мінулыя выхадныя пачула гісторыю, да якой прычынілася найперш газета. Выпадак на сёння рэдкі, таму тым больш каштоўны. Дзеля справядлівасці варта адзначыць, што тут не абышлося без сацыяльных сетак, куды ж без іх? Але каб не фота на першай паласе...

ПАМЯТАЕЦЕ, у першы дзень лета мы на першай старонцы змясцілі фота дзяцей з вёскі Грабаўка, што ў Гомельскім раёне (там яшчэ дзяўчаткі вельмі кранальна трымаюць малое качаня). Аўтар гэтага фота Андрэй Феакцістаў размясціў яго на сваёй старонцы ў сацыяльных сетках са спасылкай: маўляў, выйшла ў «Звяздзе». Маці аднаго з герояў фота здымак перапосціла ў сябе на старонцы. Пад ім пачалі пакідаць каментарыі. Андрэй як зацікаўлены аўтар гэтыя каментарыі чытаў, і адзін з іх натхніў яго зайсці «ў госці» да чалавека, які каментарый напісаў. «І вось, уяўляеце, — захоплена расказваў мне Андрэй, — гляджу я яго фотагалерэю і бачу здымак, які ёсць і ў мяне. Здымак адметны, стары, зроблены дзесьці перад Першай сусветнай вайной, на ім два ваенныя. Адзін з іх — стрыечны брат майго дзеда, таму ў нас у сямейным архіве гэтае фота і захавалася. Я напісаў гаспадару старонкі: маўляў, адкуль у вас здымак? Аказалася, што той жа самы ваенны — яго родны дзед! Карацей, мы сваякі, у нас агульны прапрадзед! Вось такая гісторыя здарылася дзякуючы «Звяздзе» — знайшоў яшчэ шмат радні, пра якую нічога не ведаў!»

Для Андрэя гэта сапраўды каштоўная знаходка — ён вельмі цікавіцца гісторыяй свайго роду. Сёння, калі тэлефанавала яму ўдакладніць дэталі, расказваў мне падрабязнасці біяграфіі таго ваеннага на фота, якія даведаўся ўжо ад яго ўнука (яны сталі перапісвацца, сазваніліся і нават дамовіліся аб сустрэчы). Падчас вайны быў паранены, ляжаў у шпіталі ў Маскве. Шпіталь наведвала імператрыца. З таго часу ў сям'і захоўваецца яе падарунак — срэбная лыжка з адмысловым вензелем... Наш гомельскі калега пра сваіх шматлікіх далёкіх і блізкіх сваякоў і прадкаў можа расказваць бясконца. Хтосьці, уцякаючы ад вайны, апынуўся ў расійскай глыбінцы, ды там і застаўся. Хтосьці праз усе нягоды вярнуўся на родную Гомельшчыну і працаваў на роднай зямлі — на будаўніцтве гуты ў Касцюкоўцы, напрыклад прадпрыемства, якое сёння вядомае ва ўсім свеце як «Гомельшкло»... Шмат пра каго ўдалося даведацца, але яшчэ столькі застаецца невядомага — раней сем'і былі вялікія, у некаторых па дзесяцёра дзяцей, і ў кожнага свой лёс, і ад кожнага — новая галінка на вялікім радавым дрэве.

Я слухала захоплены аповед зацікаўленага чалавека, радавалася за тое, што «Звяздзе» ўдалося дапамагчы яму ў яго пошуках. Але думала яшчэ і пра іншае. Пра тое, наколькі мы, сённяшняе дарослае пакаленне, не кажучы пра нашых дзяцей і ўнукаў, ведаем гісторыю сваёй сям'і далей, чым дзед і бабуля? Калі справа датычыцца ветэранаў Вялікай Айчыннай — тут яшчэ не так праблемна, і немалую ролю іграе ў тым школа, у якой абавязкова вучня спытаюць пра наяўнасць геранічных продкаў. А што робім мы самі, каб памяць тую захаваць? У нашых сучасных гарадскіх кватэрах і нават у вясковых дамах з новымі пластыкавымі вокнамі ўжо не вісяць, як раней, партрэты прадзедаў і прабабуль у вясельных строях, ваенных з пагонамі або з «лычкамі». І калі яшчэ ў 1980-х, дэкламуючы верш: «Гляньце, паглядзіце на партрэт. Хто гэта ў будзёнаўцы? Гэта ж дзед!», вучні малодшых класаў вельмі нават выразна ўяўлялі, пра што яны чытаюць, дык сёння нават сямнаццацігадовыя хіба перапытаюць, што такое «будзёнаўка». Старыя фотаальбомы з пажоўклымі ад часу здымкамі — дакументальныя сведчанні гісторыі сям'і і краіны, захоўваюцца ў сервантах нашых бабуль. Пакуль бабулі жывыя. Калі ж яны паміраюць — альбомы разам з сервантам за непатрэбнасцю аказваюцца на сметніцы (ведаю некалькі такіх выпадкаў асабіста). А непатрэбныя — бо невядомыя. Ці бабулі не паклапаціліся расказаць і паказаць, ці ўнукі не спяшаліся пацікавіцца — якая розніца? Вынік адзін: каму патрэбныя «фоткі» нейкіх незнаёмых (чытай: чужых) людзей?

ГАВОРАЧЫ пра гістарычную памяць, пра гісторыю малой радзімы, якая першапачатак гісторыі Радзімы вялікай, мы шмат робім для захавання ўсяго гэтага надзвычай важнага. Робім у многім арганізавана, дзякуючы таму, што пра гэта клапоцяцца дзяржаўныя інстытуты. А вось калі ўсё выходзіць на асабісты, прыватны ўзровень — тут нам не да таго, няма часу, каму гэта цікава, ёсць жа інтэрнэт... і ўсё такое. У выніку нішчыцца і сыходзіць у нябыт самае каштоўнае, як бывае заўсёды, калі носьбітаў інфармацыі зусім няшмат. Гісторыя сям'і, роду. Прападае тое самае дрэва, на якім мы і нашы нашчадкі — усяго толькі некалькі асобных галінак. Але ж ці доўга пратрымаюцца галінкі, ні на чым не мацуючыся?

ШУКАЙЦЕ сваіх блізкіх і далёкіх продкаў і родзічаў. Сёння для гэтага ёсць вялікія магчымасці — адкрытыя архівы, бязмежныя сацыяльныя сеткі. Паказвайце дзецям старыя фота, расказвайце, хто на іх. Цікаўцеся самі, што ляжыць у бабуліным серванце, пакуль бабуля жывая і можа расказаць...

Навошта? Па-першае, гэта цікава. Па-другое... Зрэшты, тут кожны павінен дадумаць сам.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

белагропромбанк
традиции будущего

**Открытое акционерное общество «Белагропромбанк» сообщает,**
***что в соответствии с решением наблюдательного совета ОАО «Белагропромбанк» от 31 мая 2023 года, протокол № 9, на основании предложения правления ОАО «Белагропромбанк»***
**5 июля 2023 года проводится внеочередное общее собрание акционеров в очной форме.**

Место нахождения общества и место проведения собрания: 220036, г. Минск, проспект Жукова, 3.

**Повестка дня**

1. О досрочном прекращении полномочий наблюдательного совета ОАО «Белагропромбанк»;
2. Об избрании членов наблюдательного совета ОАО «Белагропромбанк».

Время начала проведения собрания – 16.00.

Список лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, составляется на основании реестра владельцев ценных бумаг, сформированного по состоянию на 1 июня 2023 года. Лица, имеющие право на участие в общем собрании, могут ознакомиться с перечнем информации (документов) при подготовке к проведению собрания по адресу: г. Минск, пр-т Жукова, 3, следующим образом:

при регистрации лиц, имеющих право на участие в собрании, им предоставляются для ознакомления следующие документы:

проекты решений собрания;

сведения о кандидатах, выдвигаемых в наблюдательный совет ОАО «Белагропромбанк».

Регистрация лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, будет проводиться по месту проведения собрания 5 июля 2023 года с 15.00 до 15.45 при предъявлении документов, подтверждающих их личность и полномочия.

**Телефон для справок 8 (017) 229 64 10.**

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 2 от 10 февраля 2023 года выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.*

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «БЕЛТЕПЛОИЗОЛЯЦИЯ» (Продавец)**

Аукцион состоится **28.06.2023 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

**Лот № 1**, состав:

1. Административное здание, инв. № 450/С-19086, 247,3 кв.м;
2. Гараж, инв. № 450/С-19088, 129 кв. м;
3. Склад, инв. № 450/С-19090, 66 кв. м;
4. Склад, инв. № 450/С-19091, 179 кв. м;
5. Склад, инв. № 450/С-19092, 120 кв. м;
6. Навес, инв. № 450/С-19104, 236 кв. м;
7. Навес, инв. № 450/С-19108, 645 кв. м;
8. Навес, инв. № 450/С-19109, 432 кв. м.

Адрес: Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Брестская, д. 141, 141, корп. 1, корп. 2, корп. 3, корп. 4, корп. 5, корп. 6, корп. 7.

Начальная цена с НДС 20 % – 130 000,00 руб.
Задаток – 10 000,00 руб. Шаг аукциона – 2 %.

Земельный участок площадью 0,5819 га с кадастровым номером 425450100000001777. Право постоянного пользования.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – ino.by. Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений и задатка – 26.06.2023 в 11.00.

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**
УНП 190055182

## ООО «СпецРеализация»

объявляет о проведении вторых повторных открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ликвидируемого юридического лица – **ООО «Логтипс»**
(УНП 191657647, г. Минск, ул. Гурского, д. 22Б, адм. пом. 216)

***Дата и время проведения торгов*: 20 июня 2023 года**.

Начало – 11.00. Заявки принимаются с 09 июня 2023 года по 18 июня 2023 года.

***Место проведения торгов:*** Минск, просп. Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».

***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 23, каб. 23-5), тел. 8 (029) 684-71-76.

***Продавец:* ООО «Логтипс»** (УНП 191657647) в лице ликвидатора – директора ООО «Консалтинговая группа «ПРАВО» Мамедовой В.О.

Шаг торгов – 5 %. Задаток – 2 %. Подробная информация об имуществе, условиях торгов и порядке проведения размещена на интернет-сайте http://www.specrealization.by.

Контактный телефон для осмотра лота в рабочее время (с 9.00 до 17.00) +375296847176.

Сведения о предыдущих торгах:

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 63 (29943) за 04.04.2023 г.;

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 92 (29972) за 17.05.2023 г.

Свидетельство, печать и штампы Общества с ограниченной ответственностью «АнастасТоргГрупп» (УНП 192364837) **считать недействительными.**

**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)**

**информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Гродненскому областному потребительскому обществу**

**Аукцион состоится 28.06.2023 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209.**
**Телефон для справок 55-87-71**

| Лот № 1 | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 400/С-159346 (назначение – здание многофункциональное, наименование – здание административно-торгового и общественного питания), площадью 1 564,50 кв. м, г. Гродно, ш. Озерское, 43 и пожарная сигнализация ГР0000253.<br>Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 440100000001008366, площадью 0,1170 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания многофункционального), находящемся по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 43.<br>Условия проведения аукциона: оплату за приобретаемый объект производить путем перечисления денежных средств на расчетный счет Продавца, а также иными способами, не противоречащими действующему законодательству Республики Беларусь; расходы по государственной регистрации договора купли-продажи, перехода права собственности возлагаются на Покупателя; право собственности переходит к Покупателю после полной оплаты, передачи объекта и государственной регистрации данного права в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»; документом, подтверждающим передачу имущества, является акт приема-передачи |
| **Начальная цена продажи** | 518 562,36 руб. (пятьсот восемнадцать тысяч пятьсот шестьдесят два рубля тридцать шесть копеек) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 51 856 руб. (пятьдесят одна тысяча восемьсот пятьдесят шесть рублей) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
